Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

СТУДЗЕНЬ 11 1934 г. ЧАЦВЕР № 9 (4842) Год выдання XVII

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

ЦК КП(б)Б, тав. ГІКАЛО; СНК БССР, тав. ГАЛАДЗЕДУ; СААК'ЯНУ, палітсектару Наркамзема БССР, тав. РАТНЕКУ; Загатлёт, тав. ВАЙНОВІЧУ; Ільнэтрактарацэнтр, тав. СЕЛІВАНАВУ; „ЗВЯЗДЗЕ"

Большэвіцкае абяцанне, данае пленуму ЦК КП(б)Б і персанальна тав. Гікало аб своячасовым і поўным выкананні плана ільназагатовак большэвікі Дрысенскага раёна выканалі.

Райзагатлён і ільназаводы раёна рапартавалі канферэнцыі выкананнем плана на 100,06 проц. У тым ліку да 1 студзеня выканан план кантрактацыі і натураплаты. Да адкрыцця райпартканферэнцыі — 8 студзеня—закончана выкананне дадатковага задання.

Якасць у параўнанні з мінулым годам павышана на 40 проц. Сярэдні нумар трасты—1,42, супроць плана 1,31; у мінулым годзе 0,99. Восем сельсоветаў, 90 калгасаў план перавыканалі. Загатоўкі прадаўжаюцца.

Па даручэнню райпартканферэнцыі — БУРАЧЭЎСКІ, АНТОНАЎ, ПЛАЎНІК, ЗЕЙФМАН, ДЫБЕРШТЭЙН.

Гарачае большэвіцкае прывітанне менскай партканферэнцыі!

Канферэнцыя менскіх большэвікоў

Сёння адкрываецца менская гарадская партыйная канферэнцыя. Як канферэнцыя сталічнай партыйнай арганізацыі, буйнейшага і вядучага атрада КП(б)Б, канферэнцыя менскіх большэвікоў займае асобае месца сярод усіх іншых партыйных канферэнцый нашай рэспублікі. Да голаса менскай партыйнай канферэнцыі будуць уважліва прыслухоўвацца ўсе партыйныя арганізацыі БССР, за яе работай і рашэннямі будуць з вялікай зацікаўленасцю сачыць не толькі члены менскай арганізацыі, але і ўсе члены КП(б)Б.

Большэвікі чырвонай сталіцы Беларускай ССР падвядуць на сваёй канферэнцыі буйнейшыя вынікі сваёй барацьбы за перамогу генеральнай лініі партыі і ленінскай нацыянальнай палітыкі. Не так даўно Менск наведала амерыканская рабочая дэлегацыя, сярод якой аказалася немалькі былых менчан, эмігравуўшых на рэвалюцыі ў заакіянскую рэспубліку. Гэтыя людзі шчыра прызнаваліся, што ім цяжка пазнаць свой, гэтак добра знаёмы родны горад. І сапраўды, які аграмадны здзіўляючы кантраст паміж старым Менскам—заходнім губернскім горадам царскай Расіі — і новым Менскам — вартым назвы сталіцы БССР. За гады рэвалюцыі, у асаблівасці за гады першай пяцігодкі, Менск ператварыўся ў буйнейшы прамысловы і культурны цэнтр. Зусім, да поўнай неўзнаваемасці, рэканструявана старая саматужная тыпа прамысловасць, пабудаван рад новых буйных прадпрыемстваў. На змену архаічнай концы — крыніцы бязлікіх дасціпных анекдотаў — прыйшоў сучасны трамвай, паступова ахапіўшы ўвесь горад. На месцы старых хапунак пабудаваны шматпавярховыя каменныя дамы. Вакол вырасшых прадпрыемстваў на акраінах выраслі новыя рабочыя пасёлкі з добраўпарадкаванымі дамамі. Стварэнне і развіццё дзяржаўнага універсітэта выклікалі пабудаванне універсітэцкага гарадка.

Зусім змянілася не толькі аблічча горада. Змяніўся і характар яго насельніцтва. У сувязі з вялізарным ростам прамысловасці Менска ён можа быць цяпер па праву названы пролетарскім горадам.

15 ВНУ і ВТНУ, каля двух дзесяткаў навукова-даследчых інстытутаў, Акадэмія Навук — надаюць Менску характар буйнейшага культурнага цэнтра.

Пролетарыі Менска, пад кіраўніцтвам сваёй партыйнай арганізацыі, з поспехам змагаюцца за планы. Рад буйных прадпрыемстваў («Комунар», «Ударнік», завод імя Варашылава, «Большэвік» і інш.) выканалі гадавы план 1933 г. датэрмінова. Дасягнуты буйныя поспехі па аўладанню новай тэхнікай.

Шпарка развіваецца соцыялістычная сельская гаспадарка Менскага раёна. Звыш 73 процантаў бяднацка-серадняцкіх гаспадарак раёна ўжо аб'яднаны ў калгасах. Зроблены значныя крокі па шляху іх палітычнага і арганізацыйна-гаспадарчага ўмацавання. Асабліва значныя поспехі дасягнуты калгасамі ў гэтым годзе, у сувязі з арганізацыяй палітаддзелаў МТС і ўзмацненнем кіраўніцтва сельскай гаспадаркай з боку гарадскога камітэта партыі на аснове ўказанняў тав. Сталіна. Калгасы ў гэтым годзе нязмерна больш паспяхова, чым ва ўсе мінулыя гады, справіліся і з сяўбой, і з уборкай ураджаю, і з выкананнем дзяржаўных абавязацельстваў. Ураджайнасць на калгасных палях павысілася ў сярэднім на 30-40 проц., а па жыту — на 48,5 прсц., па аўсу яшчэ больш — на 65 прсц. Не мала калгаснікаў Менскага раёна ўжо ў гэтым годзе, у рэзультаце сумленнай работы, дасягнулі заможнага жыцця. Так, напрыклад, калгаснік Ермаловіч, з калгаса «1-я конная» за адпрацаваныя з жонкай працадні атрымаў 270 пуд. збожжавых, 725 пуд. бульбы, усякія іншыя прадукты і 1.600 руб. грашыма. Калгаснік Шкор Міхаіл з калгаса «Трудавік» атрымаў па працаднях 230 пудоў збожжавых, 430 пуд. бульбы і ўсякія іншыя прадукты. Можна прывесці рад іншых прыкладаў роста даходнасці калгаснікаў. Аб такіх даходах гэтыя калгаснікі не маглі і марыць пры аднаасобнай гаспадарцы.

Гэтыя поспехі, дасягнутыя менскімі большэвікамі к сваёй партыйнай канферэнцыі і 15-годдзю БССР —рэзультат упартай барацьбы за генеральную лінію партыі і ленінскую нацыянальную палітыку. Каб забяспечыць гэтыя поспехі, партыйнай арганізацыі прышлося правесці вялікую барацьбу з элементамі групаўшчыны, месніцтва, сямейственасці, дробна-буржуазнай расхлябанасцю, рэшткамі ўплыва дробна буржуазных партый, у прыватнасці бундзізма, з бюракратычнымі метадамі кіраўніцтва і пустой дэкларацыйнасцю.

Вялікую дапамогу ў гэтай барацьбе менскай партарганізацыі аказаў ЦК КП(б)Б і асабіста т. ГІКАЛО. Вялікую ролю ў паляпшэнні работы менскай партыйнай арганізацыі, як і ўсёй партарганізацыі БССР, адыгралі ўказанні ЦК ВКП(б) аб неабходнасці ўзмацнення барацьбы з славенска-дэкларацыйным; адносінамі да задач партыі і скажаннямі нацыянальнай палітыкі. Гэтыя ўказанні ЦК ВКП(б), адносіўшыяся да ўсёй КП(б)Б, у найбольшай меры датычыліся менскай арганізацыі, як арганізацыі сталічнай, якая павінна паказваць узоры большэвіцкіх спраў усім іншым партарганізацыям БССР і нясе вялізарную адказнасць за работу цэнтральных устаноў рэспублікі.

З прычыны аслаблення большэвіцкай пільнасці партыйных ячэек, арганізацыя праглядзела масіраваўшчыну ў Наркамземе, шкодніцтва ў трактарацэнтрах, актывізацыю нацдэмаўшчыны ва ўстановах Наркамасвіты і Акадэміі Навук. Арганізацыя недастатково кіравала ходам большэвіцкай беларусізацыі, практычным ажыццяўленнем нацыянальнай палітыкі і тым самым дазволіла нацдэмам хаваць сваю падрыўную антысавецкую работу пад нацыянальным сцягам, выкарыстоўваць беларусізацыю ў мэтах адрыва БССР ад СССР.

Выкрытая контррэволюцыйная нацыяналістычная арганізацыя зноў з асаблівай пераканальнасцю паказала здрадніцкі контрэволюцыйны характар беларускага нацыянал-дэмакратызма гэтай прадажнай агентуры імперыялізма, і паставіла перад усёй партарганізацыяй ва ўсёй вастраце і важнасці пытанне аб рашучай бязлітаснай барацьбе супроць на цыяналізма і шавінізма, у асаблівасці супроць беларускага нацыяналізма, як галоўнай небяспекі ў даны момант ва ўмовах Беларусі.

Напрамак галоўнага агня супроць беларускага нацыяналізма, зразумела, не азначае аслаблення барацьбы супроць вялікарускага шавінізма, які застаецца галоўнай небяспекай у маштабе ўсяго Совецкага Саюза і ўсёй ВКП(б).

Правільнае большэвіцкае правядзенне нацыянальнай палітыкі з'яўляецца важнейшай прадпасылкай далейшых перамог у гаспадарчым і нацыянальна-культурным будаўніцтве. Больш рэвалюцыйнай пільнасці да недабітага класавага ворага, да рэштак разгромленага кулацтва, якія спрабуюць ва ўмовах нацыянальнай рэспублікі прыкрываць сваю шкодніцкую антысавецкую дзейнасць фальшыва-нацыянальным сцягам!

Больш канкрэтнага кіраўніцтва прамысловасцю! Канферэнцыя не можа прайсці міма таго факта, што рад прадпрыемстваў Менска не выканаў плана першага года другой пяцігодкі, што яшчэ вельмі нізкая якасць прадукцыі.

Асаблівая ўвага павінна быць звернута на далейшае паляпшэнне абслугоўвання бытавых і культурных запатрабаванняў рабочых. У прыватнасці, неабходна, каб у далейшым не паўтаралася тое, што мела месца гэтай зімой у снабжэнні горада апалам. Вялікай увагі заслугоўвае работа ОРС'аў і ЗРК, становішча прыгарадных гаспадарак.

Пролетарыі Менска ў сувязі з XVII з'ездам партыі ўзялі на сябе рад абавязацельстваў. Неабходна гэтыя абавязацельствы ператварыць у канкрэтныя большэвіцкія справы.

Менская партыйная арганізацыя прышла да сваёй канферэнцыі згуртаванымі радамі. Закончыўшаяся чыстка партарганізацыі, прайшоўшыя перавыбары ў нізавых звяннях паказалі вялікі ідэйны рост партыйных радоў, іх беззаветную адданасць справе партыі і рабочага класа.

Вялікія нашы перамогі і заваяванні. Але яшчэ больш грандыёзныя задачы разгортвае партыя ў тэзісах ЦК ВКП(б) да XVII з'езда. Тэзісы дакладаў т. т. Молатава і Куйбышава намячаюць новы, яшчэ больш вялікасны этап у нашай вялікай барацьбе за комунізм. Мы ўшчыльную падыйшлі да стварэння бясклясавага соцыялістычнага грамадства.

Новыя грандыёзныя задачы патрабуюць карэннай перабудовы ўсёй арганізацыйна-практычнай работы партыі. Тэзісы даклада тав. Кагановіча даюць тую арганізацыйную аснову, якая забяспечыць выкананне новых задач.

Менская партыйная арганізацыя павінна паказаць усім партарганізацыям БССР узоры большэвіцкай перабудовы ўсёй арганізацыйна-практычнай работы ў адпаведнасці з новымі задачамі. Яна павінна стаць для ўсіх арганізацый КП(б)Б сапраўдным узорам барацьбы за ленінізм, за ажыццяўленне вялікага плана другой пяцігодкі.

Канферэнцыя менскіх большэвікоў пройдзе пад знакам згуртавання вакол ленінскага ЦК ВКП(б) і т. Сталіна. Менскія большэвікі пад непасрэдным кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б і тав. Гікало, мабілізуючы працоўныя масы на далейшае пераможнае соцыялістычнае наступленне, рашуча змагаючыся супроць усялякіх праяўленняў апартунізма і нацыяналізма, умацоўваючы інтэрнацыянальнае адзінства працоўных, падымаючы большэвіцкую дысцыпліну ў сваіх радах, забяспечаць выкананне новых вялікіх задач, пастаўленых партыяй.

Большэвіцкае прывітанне менскай партыйнай канферэнцыі!

ЦК ВКП(б)—тав. СТАЛІНУ

ТРЭЦЯЯ ГАРАДСКАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ ВІЦЕБСКАЙ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ ШЛЕ ГАРАЧАЕ БОЛЬШЭВІЦКАЕ ПРЫВІТАННЕ т. СТАЛІНУ — ЛЕПШАМУ РУЛЯВОМУ КРАІНЫ СОВЕТАЎ, ЛЮБІМАМУ ПРАВАДЫРУ ПАРТЫІ І ПРОЛЕТАРЫЯТА ЎСЯГО СВЕТА.

ПАД НЕПАСРЭДНЫМ КІРАЎНІЦТВАМ ЦК ВКП(б) І ТАВ. СТАЛІНА НАША КОМПАРТЫЯ, УВЕСЬ СОВЕЦКІ САЮЗ І ЯГО НЕАДРЫЎНАЯ ЧАСТКА — СОВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ ПРЫХОДЗІЦЬ ДА 15 З'ЕЗДА КП(б)Б І 17 З'ЕЗДА ВКП(б) З ВЕЛІЗАРНЫМІ ПЕРАМОГАМІ.

НАШ ВІЦЕБСКІ РАЁН, ЯКІ ДОЎГІ ЧАС БЫЎ У ГЛЫБОКІМ ПРАРЫВЕ, ЦЯПЕР, ПАД НЕПАСРЭДНЫМ КІРАЎНІЦВАМ ЦК КП(б)Б І АСАБІСТА ТАВ. ГІКАЛО, ДАБІЎСЯ РАДУ ЗНАЧНЫХ ЗРУХАЎ. АЛЕ ГЭТЫЯ ЗРУХІ НАС НЕ МОГУЦЬ СУПАКОІЦЬ, ЯНЫ НАС З АСАБЛІВАЙ СІЛАЙ АБАВЯЗВАЮЦЬ, КАБ У БЛІЖЭЙШЫ ЧАС ДА ВІЦЦА ПОЎНАГА 100-ПРОЦАНТНАГА, ВЫСОКАЯКАСНАГА ВЫКАНАННЯ ПРАМФІНПЛАНА, ДАБІЦЦА ДАЛЕЙШЫХ ПЕРАМОГ ДЛЯ АЖЫЦЦЯЎЛЕННЯ БАЯВОГА ГІСТАРЫЧНАГА ЛОЗУНГА АБ ПЕРАТВАРЭННІ ЎСІХ КАЛГАСАЎ У БОЛЬШЭВІЦКІЯ І ЎСІХ КАЛГАСНІКАЎ У ЗАМОЖНЫХ.

ПРАПРАЦОЎВАЮЧЫ ТЭЗІСЫ ДА 17 ПАРТЫЙНАГА З'ЕЗДА, МЫ БАЧЫМ, ЯК ЧЫРВОНАЙ НІТКАЙ ПРАЗ УВЕСЬ ПЛАН ВЯЛІКІХ РАБОТ ДРУГОЙ ПЯЦІГОДКІ ПРАХОДЗЯЦЬ ТВАЕ СЛОВЫ, СКАЗАНЫЯ АЛЭСКІМ КАЛГАСНІКАМ АБ ТЫМ, ШТО З ГЭТАГА ЧАСУ МЫ БУДЗЕМ ВЫПУСКАЦЬ У ДВА, У ТРЫ РАЗЫ БОЛЬШ ТАВАРАЎ ШЫРОКАГА СПАЖЫВАННЯ.

ГЭТА ЎСКЛАДАЕ ВЫКЛЮЧНА ВЯЛІКУЮ АДКАЗНАСЦЬ І НА НАШУ ВІЦЕБСКУЮ ПАРТАРГАНІЗАЦЫЮ Ў СПРАВЕ КАРЭННАГА ПАЛЯПШЭННЯ РАБОТЫ ВІЦЕБСКАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ, ЯКАЯ Ў ЗНАЧНАЙ СТУПЕНІ ВЫРАБЛЯЕ ПРАДМЕТЫ ШЫРОКАГА СПАЖЫВАННЯ, У СПРАВЕ ДАЛЕЙШАГА ПАЛЯПШЭННЯ МАТЭРЫЯЛЬНА-БЫТАВОГА СТАНОВІШЧА РАБОЧЫХ МАС.

ПЕРШЫЯ ЗРУХІ Ў НАС У РАБОЦЕ ЁСЦЬ, АЛЕ ЎСЁ-Ж ПРАЦУЕМ МЫ ПАКУЛЬ ШТО ДРЭННА, БО ЯШЧЭ ЗНАЧНАЯ ЧАСТКА НАШЫХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ НЕ ДАБІЛАСЯ СТОПРОЦАНТНАГА ВЫКАНАННЯ ПРАМФІНПЛАНА, ЯШЧЭ НЯПОЎНАСЦЮ ЗАСЫПАНЫ НАСЕННЫЯ І СТРАХАВЫЯ ФОНДЫ, НЯПОЎНАСЦЮ ВЫКАНАН ПЛАН ІЛЬНАЗАГАТОВАК.

МЫ ЗАПЭЎНЯЕМ ЛЕНІНСКІ ЦК ВКП(б) І ЦЯБЕ, ТАВ. СТАЛІН, ШТО, УЗНАЧАЛІЎШЫ РАСТУЧЫ ЭНТУЗІЯЗМ РАБОЧЫХ І КАЛГАСНЫХ МАС, МЫ НА СПРАВЕ КАНКРЭТНЫМІ БОЛЬШЭВІЦКІМІ СПРАВАМІ РЭАЛІЗУЕМ ТЫЯ ГРАНДЫЁЗНЫЯ ЗАДАЧЫ, ЯКІЯ ПАСТАЎЛЕНЫ Ў ТЭЗІСАХ ДА 17 З'ЕЗДА ВКП(б). РАЗГОРНУТАЙ ПРАГРАМЕ ПАБУДОВЫ БЯСКЛЯСАВАГА СОЦЫЯЛІСТЫЧНАГА ГРАМАДСТВА, ЗАМАЦОЎВАЮЧЫ ВЫНІКІ ЧЫСТКІ, ВЯДУЧЫ НЕ ПРЫМІРЫМУЮ БАРАЦЬБУ З КЛАСАВЫМ ВОРАГАМ І ЯГО АГЕНТУРАЙ — АПАРТУНІСТАМІ ЎСІХ МАСЦЕЙ, ЯКІЯ Ў СВАЁЙ ПАДРЫЎНОЙ КОНТР-РЭВОЛЮЦЫЙНАЙ РАБОЦЕ ЧАСТА ПРЫКРЫВАЮЦЦА ФАЛЬШЫВА-НАЦЫЯНАЛЬНЫМ СЦЯГАМ.

НЯХІЛЬНА АЖЫЦЦЯЎЛЯЮЧЫ ЛЕНІНСКУЮ НАЦЫЯЛІТЫКУ, БЯЗЛІТАСНА ЗМАГАЮЧЫСЯ З ВЯЛІКАРУСКІМ ШАВІНІЗМАМ, ЯКІ З'ЯЎЛЯЕЦЦА ГАЛОЎНАЙ НЕБЯСПЕКАЙ Ў МАШТАБЕ ЎСЯГО СССР І ЎСЁЙ ВКП(б), МЯСЦОВЫМ БЕЛАРУСКІМ КОНТР-РЭВОЛЮЦЫЙНЫМ НАЦЫЯНАЛІЗМАМ, ЯК ГАЛОЎНАЙ НЕБЯСПЕКАЙ НА ДАНЫМ ЭТАПЕ Ў БССР, ШАВІНІЗМАМІ ЎСІХ МАСЦЕЙ,—МЫ ЯШЧЭ БОЛЬШ ЗАГАРТУЕМ НАШЫ РАДЫ ДЛЯ ДАЛЕЙШЫХ ПЕРАМОГ У БУДАЎНІЦТВЕ СОЦЫЯЛІЗМА, ПРАНІЗВАЮЧЫ ЎСЮ СВАЮ РАБОТУ ПРОЛЕТАРСКАЙ САМАКРЫТЫКАЙ І БАРАЦЬБОЙ ЗА ЯЕ ДЗІЙСНАСЦЬ. НЯХІЛЬНА РАЗВІВАЮЧЫ ЎКАЗАННІ ПРАВЕРКОМАЎ ПА ЧЫСТЦЫ.

НЯХАЙ ЖЫВЕ ЛЕНІНСКІ ШТАБ — ЦК ВКП(б) І ЛЮБІМЕЙШЫ ПРАВАДЫР І НАСТАЎНІК НАШАЙ ПАРТЫІ І ПРОЛЕТАРЫЯТА ЎСЯГО СВЕТА ТАВ. СТАЛІН!

ЗМАГАЦЦА ЗА НОВЫЯ ПОСПЕХІ

З дакладу т. ГАЛАДЗЕДА на віцебскай партканферэнцыі

ВІЦЕБСК, 9. (Па тэлефону ад нашай спец. брыгады).

З вялікім дакладам аб рабоце ЦК КП(б)Б, спатканы бурнымі апладысментамі, выступіў старшыня СНК БССР тав. ГАЛАДЗЕД. У сваім дакладзе тав. Галадзед даў аналіз міжнароднага становішча і поспехаў усяго Совецкага Саюза і яго неадлучнай часткі БССР на ўсіх франтах соцыялістычнага будаўніцтва, з якімі партыя прыходзіць да сваіх гістарычных з'ездаў — 15 з'езда КП(б)Б і 17 з'езда ВКП(б).

Тав. Галадзед асабліва падрабязна спыняецца на тэзісах т.т. МОЛАТАВА, КУЙБЫШАВА і КАГАНОВІЧА. Калі першыя — тэзісы Молатава і Куйбышава, — гаворыць тав. Галадзед, — даюць нам разгорнутую праграму пабудовы бясклясавага грамадства, то тэзісы тав. Кагановіча вызначаюць шляхі і метады ў ажыццяўленні гэтай вялікай праграмы.

Потым тав. Галадзед гаворыць аб дасягненнях БССР, ілюструючы іх лічбамі і фактамі. Гэтыя дасягненні — рэзультат перамогі генеральнай лініі партыі, перамогі ленінскай нацыянальнай палітыкі. Яны — рэзультат непрымірымай барацьбы КП(б)Б на чале з тав. ГІКАЛО пры непасрэдным кіраўніцтве і дапамозе ЦК ВКП(б) і асабіста тав. СТАЛІНА з апартунізмам розных колераў, з беларускім нацыянал-дэмакратызмам, як галоўнай небяспекай на даным этапе ў БССР і вялікадзяржаўным шавінізмам — галоўнай небяспекай у маштабе ўсяго СССР і ўсёй ВКП(б).

Побач з буйнымі дасягненнямі тав. Галадзед адзначыў рад сур'ёзных недахопаў на асобных участках соцыялістычнага будаўніцтва. Тав. Галадзед канцэнтраваў увагу канферэнцыі на неабходнасці яшчэ больш цвёрдых крокаў аб паляпшэнні матэрыяльна-бытавога становішча рабочага і калгасніка і асабліва на неабходнасці паляпшэння камунальнай гаспадаркі.

Ацэньваючы работу Віцебскай партарганізацыі, тав. ГАЛАДЗЕД адзначыў, што новае партыйнае кіраўніцтва, улічыўшы ўрокі мінулага, зрабіла неабходныя высновы з рашэнняў ЦК КП(б)Б аб рабоце Віцебскай партыйнай арганізацыі і на аснове гэтага рашэння і правядзення чысткі партыі забяспечыла рашучы пералом у рабоце ўсёй Віцебскай партыйнай арганізацыі.

Ад глыбокага прарыва ў першым паўгоддзі Віцебшчына выцягнулася зараз у перадавыя раёны БССР і прыходзіць да 15 з'езда КП(б)Б і 17 з'езда ВКП(б) згуртаванай і манапітнай калонай.

Адначасова тав. Галадзед завастрыў увагу канферэнцыі на тым, што Віцебская партыйная арганізацыя не павінна супакойвацца на дасягнутым. Бліжэйшыя задачы — поўнае выкананне ільназагатовак, поўная падрыхтоўка да веснавой сяўбы і далейшае паляпшэнне работы прамысловасці, галоўным чынам паляпшэнне якасці прадукцыі. Тав. Галадзед выказаў упэўненасць, што Віцебская партарганізацыя даб'ецца яшчэ больш поспехаў.

Па дакладу тав. Галадзеда разгарнуліся шырокія спрэчкі. У спрэчках выступіў з вялікай прамовай нам, старшыня ЦКК-РСІ тав. Конік, старшыня гарсовета тав. Баскін і інш.

Усе выступаўшыя адзначылі, што ЦК КП(б)Б на чале з тав. ГІКАЛО забяспечвае сапраўднае большэвіцкае кіраўніцтва ўсімі ўчасткамі соцыялістычнага будаўніцтва БССР і аказвае выключна вялікую дапамогу Віцебскай партыйнай арганізацыі ў яе рабоце.

У часе работы канферэнцыі па тэатра адбылася масавая дэманстрацыя рабочых і ІТР, студэнтаў, навуковых работнікаў, моладзі і піонераў. Канферэнцыю вітала работніца-ўдарніца ільнапрадзільнай фабрыкі «Дзвіна»: «Наша праца, — гаворыць старая работніца фабрыкі тав. БАРАНОЎСКАЯ,—будзе самай лепшай у свеце пражай».

Бурнымі апладысментамі спаткала канферэнцыя дэлегатаў калгасаў з МТС, якія рапартавалі аб выкананні сваіх абавязацельстваў перад дзяржавай і гатоўнасці да веснавой сяўбы. З вялікай напружанай увагай заслухалі дэлегацыі канферэнцыі рапарт баявых лётнікаў Віцебскага гарнізона.

Канферэнцыя паслала прывітальныя тэлеграмы т.т. МОЛАТАВУ, КАГАНОВІЧУ, ГІКАЛО, «ПРАВДЕ» і «ЗВЯЗДЗЕ».

Канферэнцыя аднадушна прыняла рэзалюцыю па дакладу тав. Галадзеда, У ЯКОЙ ПРЫЗНАЛА ПАЛІТЫЧНУЮ ЛІНІЮ ЦК ПРАВІЛЬНАЙ І ПРАКТЫЧНУЮ РАБОТУ ЗДАВАЛЬНЯЮЧАЙ.

Сёння на ранішнім пасяджэнні канферэнцыя заслухала справаздачу гаркома КП(б)Б.

БРЫГАДА «ЗВЯЗДЫ» ШЧАДЗІ-СТАЎ, БРАЙНІН.

Наш рост—перамога ленінскай нацыянальнай палітыкі

З даклада сакратара ЦК КП(б)Б тав. ШАРАНГОВІЧА на гомельскай партканферэнцыі

ГОМЕЛЬ, 9 студзеня. (Па тэлефону ад брыгады «Звязды»).

Сёння на ранішнім пасяджэнні гарадской партканферэнцыі з вялікім дакладам выступіў спатканы бурнымі апладысментамі сакратар ЦК КП(б)Б тав. ШАРАНГОВІЧ.

— Партыя, — гаворыць т. ШАРАНГОВІЧ,—прыходзіць да XVII з'езда ВКП(б) і XV з'езда КП(б)Б, да 15-годдзя з дня першага з'езда компартыі Беларусі, як ніколі ідэйна згуртаванымі, большэвіцкі спаянымі радамі. Гэтыя даты супадаюць з 10-годдзем з дня смерці настаўніка і правадыра нашай партыі і сусветнага пролетарыяту ВЛАДЗІМІРА ІЛЬІЧА ЛЕНІНА. Дасяг по год як рабочы клас і ўся наша партыя пад кіраўніцтвам геніяльнага рулявога тав. СТАЛІНА змагаецца за ажыццяўленне заветаў ЛЕНІНА.

Галоўнейшым рэзультатам ажыццяўлення ленінскіх заветаў з'яўляецца небывалы ў свеце рост нашай народнай гаспадаркі, сакрушальнай сілы нашай краіны, з якою павінен лічыцца капіталістычны свет.

Ахарактарызаваўшы міжнароднае становішча СССР, тав. ШАРАНГОВІЧ завастрыў увагу канферэнцыі на неабходнасці ўзмацнення абарончай работы, большай сувязі і дапамозе Чырвонай арміі.

— Мы знаходзімся на мяжы з капіталістычным Захадам, таму перад КП(б)Б стаіць асабліва адказная задача — умацаваць абарончую магутнасць краіны.

Радам многазначных лічбаў ілюструе тав. ШАРАНГОВІЧ гаспадарчы і культурны рост СССР і БССР за першую пяцігодку.

Гісторыя развіцця БССР гэта гісторыя ператварэння жабрацкай, прынечанай царскай калоніі з адсталай сельскай гаспадаркай, пазбаўленай прамысловасці, у перадавую квітнеючую індустрыяльна-аграрную рэспубліку Саюза ССР. Мы за першае пяцігоддзе ўклалі ў прамысловасць БССР 450 млн. рублёў. Пабудаваны такія гіганты, як гомельскі шклазавод імя СТАЛІНА, крычаўскі цэментны завод, магілёўская фабрыка штучнага шоўку, віцебская фабрыка «Сцяг індустрыялізацыі» і інш. Калі па ўсяму СССР тэмпы роста прадукцыі за першую пяцігодку складаюць 219 проц., то тэмпы роста прадукцыі БССР за гэты час складаюць 418 проц. Вось рэзультаты практычнага ажыццяўлення ленінскай нацыянальнай палітыкі, накіраванай на хутчэйшы ўздым раней адсталых акраін і нацыянальнасцей, вось дзе рэзультаты геніяльнага кіраўніцтва ЦК ВКП(б) і яго правадыра тав. СТАЛІНА, вось дзе рэзультат брацкай дапамогі рабочага класа ўсяго СССР.

Якія недахопы мы маем у галіне прамысловасці? Калі гаварыць аб паасобных перыядах работы прамысловасці, аб асобных показальніках, то недахопаў, аказваецца, безумоўна нямала. У 1933 годзе, напрыклад, прамысловасць БССР выканала план на 93,6 проц., прычым зніжэнне сабекошту толькі на 2,6 проц. замест 16,5 проц. па плану. Старое гніпоў кіраўніцтва наркамата лёгкай прамысловасці, якое ўзначальвалася Грысевічам, па сутнасці справы ігнаравала выкананне пастаноў ліпеньскага пленума ЦК і ЦКК ВКП(б), які ўскрыў прычыны адставання прадпрыемстваў лёгкай прамысловасці і ўказаў шляхі ліквідацыі прарываў.

Сур'ёзнейшым прабелам у рабоце астаецца слабае асваенне новых прадпрыемстваў. За выключэннем магілёўскай фабрыкі штучнага шоўку, ні адно прадпрыемства, пабудаванае ў першую пяцігодку, яшчэ поўнасцю не асвоена, і таму мяцць месца прадукты ў вышэйшай прыма. АДСЮЛЬ УСЯ АКТУАЛЬНАСЦЬ БАРАЦЬБЫ ЗА АЎЛАДАННЕ ТЭХНІКАЙ. ЗА ЎКАРАННЕННЕ ТЭХНІЧНЫХ ВЕДАЎ У МАСЫ РАБОЧЫХ, ЗА РАЗГОРТВАННЕ ІЗОТАЎСКАГА РУХУ І Т. Д. Дрэнна з якасцю прадукцыі. У гэтых адносінах асабліва выдзяляюцца прадпрыемствы шкіпрэй (фабрыка «Сцяг індустрыялізацыі») і гарбарная прамысловасці.

Тав. ШАРАНГОВІЧ, звярнуўшы ўвагу канферэнцыі на задачы далейшага развіцця лёгкай, харчовай і саматужнай прамысловасці, мяцчых за ўмовах БССР асабліва вялікія магчымасці, падрабязна спыняецца на задачах пашырэння культуры на прадпрыемствах. БАРАЦЬБА ЗА КУЛЬТУРНЫЯ ЦЭХІ. ЗА КУЛЬТУРНЫЯ ЗАВОДЫ І ДВАРЫ ПАВІННА СТАЦЬ НЕАДЛУЧНАЙ ЧАСТКАЙ БАРАЦЬБЫ ЗА ПЛАН.

Значныя поспехі дасягнуты ў галіне транспарта. Аднак, гэта ніколі не павінна замазваць тых вялікіх недахопаў, якія яшчэ ёсць у яго рабоце. Чыгуначны транспарт усё яшчэ не перабудаваўся ў адпаведнасці з указаннямі ЦК ВКП(б) і СНК СССР. Далейшая барацьба за ачыстку транспарта ад класава-варожых, чыноўніцкіх і дэзарганізатарскіх элементаў, ад сабатажнікаў і «очковтирателей» — задача партаргарганізацыі, усёй партарганізацыі. Палітаддзелы ўжо правялі адпаведную работу. Устаноўлен большэвіцкі перадвах на транспарце, маем моцную і сістэматычную дапамогу з боку ўсёй партыі і ўсяго лепшага, што ёсць у рабочым класе.

БССР мае вялікія поспехі і ў дарожным будаўніцтве. Аднак, поспехі не могуць ні ў якім выпадку нас задаволіць. Заключаныя нашай урадавай дэлегацыяй сацыялістычныя дагаворы на перажнае будаўніцтва з Чувасай АССР і палам іншых рэспублік і абласцей Саюза абавязваюць нас яшчэ больш прыналегчы на гэты ўчастак работы.

Падрабязна ўказаўшы дасягненні ў галіне сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, тав. ШАРАНГОВІЧ ставіць перад партканферэнцыяй рад сур'ёзных задач па падрыхтоўцы да веснавой сяўбы, па хуткаму паляпшэнню работы соўгасаў, развіццю жывёлагадоўлі, прыцягненню да работы жанчын і т. д.

ПАДРЫХТОЎКА ТРАКТАРА, АРГАНІЗАЦЫЯ ГУРТКОЎ ПА ВЫВУЧЭННЮ ТРАКТАРАЎ, ПАДРЫХТОЎКА ЦЯГАВАЙ СІЛЫ. ПЫТАННІ ПЛАНАВАННЯ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ, ПАДРЫХТОЎКА КАДРАЎ, АГРАВУЧОБА КАЛГАСНІКАЎ — УСЕ ГЭТЫЯ ПЫТАННІ ПАТРАБУЮЦЬ НЕАДКЛАДНЫХ ПРАКТЫЧНЫХ МЕР. Між тым, рамонт трактараў у Гомелі праходзіць слаба. Трэба ва што-б там ні стала да 15 з'езда КП(б)Б прывесці трактарны парк у поўную спраўнасць.

У гэтым годзе павінна быць шырока прасунута ініцыятыва перадавых калгаснікаў аб ліквідацыі хутароў і сцягванні іх у арэны цэнтр. 100 ТЫСЯЧ ГА ПШАНІЦЫ, ЯКІЯ ПАВІННЫ БЫЦЬ ЗАСЕЯНЫ Ў ГЭТЫМ ГОДЗЕ, СУПРОЦЬ 60 ТЫСЯЧ ГА Ў МІНУЛЫМ ГОДЗЕ, АБАВЯЗВАЮЦЬ НАС ПРАВЕСЦІ АДПАВЕДНУЮ РАБОТУ ПА МАБІЛІЗАЦЫІ ЎСІХ КАЛГАСНІКАЎ НА АСВАЕННЕ ГЭТАЙ НОВАЙ КУЛЬТУРЫ. Асабліва значэнне гэта набывае ў Гомельшчыне, як паўднёвым раёне, дзе гэта культура знойдзе найбольш шырокае прыстасаванне.

Вялікае месца ў сваім дакладзе тав. ШАРАНГОВІЧ аддаў пытанню роста матэрыяльна-бытавога забеспячэння рабочых і калгаснікаў, павялічэння таваразвароту і выпуску прадуктаў шырокага спажывання, задачам барацьбы за культурную сталоўку і т. д.

Раздзел аб культурна-нацыянальным будаўніцтве БССР тав. ШАРАНГОВІЧ пачаў падрабязным асвятленнем той контр-рэволюцыйнай работы, якую праводзілі нацдэмы ў радзе галін гаспадарчага і культурнага будаўніцтва, і дапамогі, якую ім у гэтым аказвалі нацыянал-апартуністы ўнутры партыі. Нацдэмы—агенты імперыялістаў — ставілі канкрэтную задачу ператварэння БССР у калонію польскага і нямецкага фашызма. Вы ведаеце, што мы ў свой час правялі абмен эняволеных у Польшчы РАК-МІХАЙЛОЎСКАГА, МЯТЛЫ, ДВАРЧАНІНА і іншых, як барацьбітоў нацыянальна-вызваленчага руху Заходняй Беларусі і Польшчы, а на справе яны аказаліся шпіёнамі імперыялістычных дзяржаў. Наша партыя пры дапамозе ЦК ВКП(б) выкрыла і разграміла контр-рэволюцыйнае гняздо. Задача зараз заключаецца ў тым, каб з коранем да рэшты выжыць контр-рэволюцыйнае ахвосце з усіх участкаў нашага будаўніцтва, каб яшчэ больш узняць класавую пільнасць і ахоўваць сцяг пролетарскага інтэрнацыяналізма.

Спыніўшыся на недахопах работы вышэйшых навучальных устаноў і кіраўніцтва імі з боку адпаведных наркаматаў, тав. ШАРАНГОВІЧ спецыяльны раздзел у сваёй прамове прысвяціў арганізацыйным пытанням, якія высунуты ў тэзісах тав. КАГАНО

ЗМАГАЮЧЫСЯ ЗА ГЕНЕРАЛЬНУЮ ЛІНІЮ ПАРТЫІ, ЗА ЛЕНІНСКУЮ НАЦПАЛІТЫКУ

Менская партыйная арганізацыя прыйшла да сваёй партканферэнцыі з новымі перамогамі

СКАНЦЭНТРАВАЦЬ УСЮ ЎВАГУ І ЎСЕ СІЛЫ НА ВЫКАНАННЕ ЯШЧЭ НЕВЫРАШАНЫХ ЗАДАЧ

Е. Кузняцоў

Сакратар парткома машынабудаўнічага завода „Комунар"

НА ДАСЯГНУТЫМ НЕ СПЫНЯЦЦА

Большэвікі менскага машынабудаўнічага завода «Комунар» гарадскую партканферэнцыю сустракаюць вялікай перамогай. Прамфінплан 1933 года выкананы да 20 снежня. А да 1-га студзеня гадавое заданне выканана на 104,4 проц. Здана дзяржаве прадукцыі на 4.279.700 руб.

Тав. КУЗНЯЦОЎ.

Барацьба за колькасныя паказалі нікі суправаджалася барацьбой за якасць выпускаемай прадукцыі. Прадукцыйнасць працы ўзнята на 14,3 проц. замест запраектаваных па плану 4,5 проц. Сабекошт знижан на 8,9 проц. замест прадугледжаных планам 3,4 проц. Зарплата рабочых павысілася на 10,2 проц. А ў выдатковай частцы фондаў зарплаты з'эканомлена 47 тыс. руб. (4,8 проц. да агульнага ліку зарплаты).

Гэтыя поспехі дасягнуты ў выніку спраўднага ажыццяўлення указанняў камісіі па чыстцы, у выніку шырокага разгортвання партыйна-масавай работы.

Разгортванне большэвіцкай крытыкі і самакрытыкі і актыўны ўдзел усяго рабочага калектыва ў чыстцы перагрупаваў выкрылі ўсе недахопы нашай работы. Указанні праверкома сталі магутным вагаром для перабудовы і ўмацавання работы партарганізацыі завода. Цяжар работы перанесен непасрэдна ў низавое звяно. Да работы прыцягнут новы актыў, які выяўлен у часе чысткі. І работа пашла значна лепш.

Вось партгрупа тав. **Дразда**. Яна абяднае рашаючыя брыгады механічнага цэха. Парторгам тав. Дразда вылучылі пасля чысткі і, праба сказаць, тав. Дрозд з упасцяжай яму большэвіцкай настойлівасцю бярэцца за работу. На завод Дрозд прыйшоў тры гады таму назад малакваліфікаваным рабочым. Ён хутка асвойвае тэхніку вытворчасці і становіцца высокакваліфікаваным кавалём. Дрозд усім комуністам, усім рабочым брыгады паказвае прыклад у рабоце. Ён з дня ў дзень свае нормы перавыконвае на 30-40 проц. Учыльняючы рабочы дзень Дрозд дабіўся таго, што ўсе комуністы яго брыгады, яго групы, з'яўляюцца лепшымі ўдарнікамі.

Брыгада тачыльных варштатаў імя Аўтадора пасля чысткі партарганізацыі пачала працаваць па-новаму. Комуністы **Коган і Акуценка** былі пасланы ў гэтую брыгаду для ўмацавання работы, для таго каб вывесці брыгаду з тых працяваў у якіх яна раней знаходзілася. Яны сябе цалкам і поўнасцю апраўдалі. Брыгада зараз ужо сваячасова і добраякасна выконвае свой прамфінплан. За 11 месяцаў тачыльшчыкі гадавое заданне выканалі на 123 проц., даўшы 1292 варштаты замест плана ў 967. Сабекошт кожнага варштата ў параўнанні з 1932 годам з 168 руб. 49 к. знижан да 141 р. 87к.

Гэта брыгада на заводзе не адна. Ударная комсамольская брыгада **Хайкіна** сістэматычна перавыконвае план выпуска помпаў. У дні вытворчага пахода імя тав. Гікало яна звыш плана дала 4 помпы.

Механічны цэх асабліва адлюстроўвае той вялікі рост, які мае ўвесь завод. За першыя пасля XVI з'езда партыі цэх зусім змяніў свой выгляд. Толькі некалькі год таму назад цэх выпускаў бетонныя варштаты, кормы рабочай сельгасінвентары і інш. маньны. А ўступіўшы ў другую пяцігодку, гэты цэх ужо працуе над выпускам складаных варштатаў, якія яшчэ зусім недаўна прывозіліся з-за мяжы. Зараз заканчваецца збоўкай двухшпіндзельны цэнтравальны варштат. Двухшпіндзельны варштат асвойваецца заводам, і ўжо ў гэтым годзе будзе наладжана масавы выпуск яго. Устанаўляецца вялікі замежны фрэзерны варштат, якім будуць апрацоўвацца дэталі для новага пілільнага варштата. Такары, слесары збіраюць і асвойваюць гэтыя варштаты.

Ліцейны цэх да чысткі партыі ўвесь час цягнуўся ў хвосце адстаючых. Вытворчае заданне ліцейны цэх пасля чысткі стаў нават перавыконваць. Раней план выконваўся на 85-90 проц. Апошнія месяцы цэх дае 116-130 проц.

Ватранчык **Шагідзевіч** мае 18-гадовы стаж ліцейшчыка, комуніст, да чысткі прымаў слабы ўдзел у партыйным жыцці. Заўсёды за ватранкай ён заставаўся непрыкметным на заводзе. Чыстка пераныхавала яго. Ён стаў зараз даволі актыўным комуністам. Шагідзевіч імкнецца на злёт ударнікаў якасці і звяртуў пыся са злёта ён стаў яшчэ больш змагацца за высокаякасныя показальнікі сваёй работы і работы ўсяго цэха. Добра вывучыўшы ватранку, Шагідзевіч свае веды перадае другім рабочым. Пасля работы ён застаецца з рабочымі і вучыць іх як дагледаць ватранку, як састаўляць шыхту, каб атрымаць высокаякасное літво, як лепш рабіць заліўку і г. д. Такім метадам ён навучыў рабочых **Кірыка, Грыневіча, Андрыеўскага, Бесіна**, зараз навучае работніка **Шахно**. Адданай работай, увагай, любоўю адносінамі да матэрыялаў ва граніцах пад кіраўніцтвам партарганізацыі дабіўся лепшага рацыянальнага выкарыстання чыгуну. Яны змагаюцца каштоўнаю агняпорнаю цэглу, выдаткоўваючы ў месяц 500 штук, замест рацейшых 1500 штук.

Метады работы ватранчыкаў Шагідзевіч пераносіць у іншыя брыгады. Так, фармоўшчык **Жлановіч** на працяку доўгага часу рабіў брак, а апошні раз нават сімуляваў. Пасля абмена вопытам работы з тав. Шагідзевічам і дапамогі апошняга, Жлановіч асвоіў тэхніку фармоўкі і стаў лепшым ударнікам. Шагідзевіч — старшыня цэхкома. І ён штодня зай маецца вывучэннем бытавых умоў рабочых. У часе сталінскага пахода па яго ініцыятыве быў праведзен рамонт кватар рабочых **Юхневіча, Судзі, Берґсльда** і інш.

Тав. САВІЦКАЯ.

Дрозд і Шагідзевіч на заводзе так сама не адны. Іх на «Комунары» дзесяткі. Комуністы становяцца на чале ўсіх рабочых завода.

Перавыбары парторганаў у нас прайшлі пад кутом праверкі таго, як кожны член і кандыдат партыі рэалізуе ўказанні камісіі па чыстцы. Індывідуальныя справаздачы забяспечаць далейшае павышэнне кіруючай ролі комуністаў на вытвор часці. Партарганізацыі цэхаў і брыгадаў завода разгарнулі барацьбу за паляпшэнне культурна-бытавых умоў рабочых. Наведванне рабочых кватар, дапамога ім у паляпшэнні бытавых умоў і правядзенне другіх масавых мерапрыемстваў забяспечваюць у далейшым яшчэ больш шчыльнае згуртаванне ўсіх рабочых вакол партарганізацыі, спрыяюць лепшай рабоце цэха і усяго завода.

Аднак, мы на дасягнутых поспехах не супакойваемся. У нас яшчэ ёсць цэлы рад буйных недахопаў. Дрэнна працуе сталоўка, неадвольняюча пастаўлена рабочае снабжэнне, не на належнай вышыні стаіць шэфства над сельсоветам, слаба пастаўлена работа са спатуваючымі і т. д. Мы, рыхтуючыся да 15 з'езда КП(б)Б і 17 з'езда ВКП(б), абавязаны ўмацніць сваю работу, павінны дабіцца поўнай ліквідацыі ўсіх недахопаў, і гэта будзе абавязкова зроблена.

Суспякаючы гарадскую партканферэнцыю буйнейшымі поспехамі, цэхі і брыгады яшчэ больш мабілізаваліся на выкананне студзеньскага плана і задання па запчастках. Узялі на сябе канкрэтныя абавязацельствы. Да XV з'езда КП(б)Б мы абяцаем даць звыш плана 4 помпы, асвойваем і пачынаем выпуск першага цэнтравальнага варштата, палепшаем вытворчае шэфства над МТМ.

Студзеньскі план па запчастках да адкрыцця XVII з'езда ВКП(б) мы абавязуемся выканаць поўнасцю. Дамо 21 тысячу поршневых і 632 гільзавых.

К. С. Гарачун

Сакратар парткалектыва завода „Ударнік"

НА ЧАЛЕ РАБОЧЫХ МАС

16 снежня 1933 года калектыў рабочых нашага завода рапартаваў аб дэтэрміновым выкананні прамфінплана на 100,5 проц. Выпуск прадукцыі роўны 105.3 проц., прадукцыйнасць працы 115,1 проц., знижэн не сабекошта на 32 супроць планавых 15 проц.

Такімі поспехамі мы сустракаем 3-ю менскую гарадскую партканферэнцыю. Поспехі нашага завода ёсць прамы результат ажыццяўлення шасці гістарычных умоў тав. Сталіна, правільнага кіраўніцтва ЦК КП(б)Б і штодзённай канкрэтнай дапамогі і кіраўніцтва з боку менгаркома партыі.

У мінулым наш завод быў працалектывам па вырабу цацак і лаво вай прадукцыі. Перавядзенне яго ў перадавы металаапрацоўчы завод узмацніла яго вагу ў агульнай сістэме прамысловасці. Зразумела, у першы час рэарганізацыі ў нас былі дрэнныя показальнікі. Увесь 1932 год мы адставалі. Кепска ішлі і ў пачатку 1933 года. Ва ўвесь рост паўстала задача дабіцца карэннага пералома. Усю партмасавую работу перанеслі ў цэх і брыгаду, і работа ў цэхах пачала наладжвацца.

З ростам завода звязан рост рабочых — лепшых ударнікаў, рост авангардзкасці членаў партыі на вытворчасці. Комуніст-ударнік не толькі лепшы рабочы, але ініцыятар і арганізатар мас. Дзякуючы таму, што ў нас такія людзі ёсць, мы перамаглі ў мінулым годзе.

Брыгаду па вырабу вагароў да поўтонных вагаў «Фалько» ўзначальвае группарторг Іоффе. Парторг па штодзённа займаецца пытаннямі вытворчасці, рэагуе на ўсе непаладкі, дапамагае адстаючым, упляе ў тэхвучобу. Наладжана сістэматычная партвучоба. Гэта брыгада першая на заводзе разгарнула прапрацоўку тэзісаў к XVII партз'езду і абавязалася студзеньскую праграму скончыць да XV з'езда КП(б)Б.

Брыгада складаецца з 16 чалавек, з якіх 7 беспартыйных рабочых. Члены партыі **Майсяновіч і Свердлова** прыкладныя і лепшыя ўдарнікі. Яны спаборнічаюць з беспартыйнымі Грышчуком і Самсонавым. Такая работа комуністаў непасрэдна ля варштата, актыўнасць і ініцыяты ва дала магчымасць брыгадзе тав. Іоффе стаць лепшай на заводзе. Вось показальнікі яе работы. За лістапад брыгада выканала план на 131 проц., за першую дэкаду снежня на 179 проц., гадавы план брыгада закончыла 11 снежня. Брак знижан да 0,5 проц., знижан сабекошт работ па вырабу вагароў з 2 р. 50 к. да 77 кап.

Трубапракацны цэх быў застойным. Некаторыя тлумачылі гэта «са матужнымі металамі пракаткі труб». У гэты цэх мы перакінулі частку лепшых комуністаў. Малюнак тут цэлкам зусім іншы. Брыгадзірам трубапракатнай брыгады тав. Белуха. Ён-жа і сакратар цэхпартячэйкі. Брыгада дабілася знижання брака да мінімума.

Цэлы рад комуністаў з'яўляецца лепшымі ўдарнікамі. Вось каваль **Файсішаў** дае высокую якасць і перавыконвае свой вытворчы план. Кандыдат партыі, машыніст паравога ацяплення **Стешкевіч** дабіўся значнай эканоміі паліва.

На заводзе вырасла шмат ударнікаў з беспартыйных рабочых. Стары слесар **Шчацінскі** выконвае заданне па рамонту варштатаў. Свой вопыт перадае маладым. **Камінскі**, які працуе на падрыхтоўцы і падгонцы кафомыслаў для ваг «Фалько», дае прадукцыю высокай якасці.

Гэта ўсё людзі, якія выраслі за апошні год. Ударніцтва і соцспаборніцтва выхавала з іх сапраўдных рабочых сацыялістычнага прадпрыемства. З кожным днём вырастаюць козыя ўдарнікі. З агульнага ліку 233 рабочых завода, сацдагаварамі ахоплена 209 чалавек. Палова рабочых займаецца тэхвучобай. Яны працуюць не толькі над авуладаннем тэхнікай, але і займаюцца рацыяналізацыяй вытворчасці. За 1933 год паступіла 126 рацыяналізатарскіх прапаноў. Эфектыўнасць ад іх склае дае 52.632 рублі.

Дасягненні завода — дасягненні нашага парткалектыва. Амаль на кожным пасяджэнні бюро мы займаліся вытворчымі пытаннямі. Кожную дэкаду, мы ставілі спраўздачу нашых прупарторгаў. Увесь цяжар работы бюро быў перанесен у цэхі. Пытанні бытавых умоў рабочых зай малі ў нас адно з першых месц. Мы абследавалі 54 рабочых кватэр, адрамантавалі 24. Лепшыя ўдарнікі **Запольскі, Дуброўскі, Гуляеў** атрымалі новыя кватэры.

Шмат увагі парткалектыў аддаваў пытанням рабочага харчавання. Сталоўка працавала дрэнна. Аказалася, што былы загадчык — Фельтман — класава-варожы элемент. Мы сваячасова выкрылі яго. Цяпер у нас сталоўка працуе, як перадавы цэх грамадзкага харчавання.

З трыбуны гарадской партыйнай канферэнцыі мы раскажам аб нашых перамогах, якія з'яўляюцца вынікам правільнага кіраўніцтва менгаркома КП(б)Б.

Уступіўшы ў другі год 2-й пяцігодкі з вялікімі поспехамі, наш завод пад кіраўніцтвам партарганізацыі будзе змагацца за выкананне далейшых задач, стаячых перад намі.

Парторг брыгады фармаўшчыкоў Асташонак.

У барацьбе за большэвіцкія калгасы

Менская партыйная арганізацыя падыходзіць да сваёй гарадской партыйнай канферэнцыі з радам буйных дасягненняў у справе сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі раёна.

Акружыць пролетарскую сталіцу БССР — МЕНСК кальцом арганізацыйна, гаспадарча і палітычна ўмацаваных высока-таварных калгасаў, дабіцца высокага ўраджаю сацыялістычных палёў — вось задача, якую паставіла перад сабой менская партарганізацыя.

Рашэнні студзенскага пленума ЦК і ЦКК ВКП(б), гістарычная прамова тав. СТАЛІНА аб рабоце ў вёсны сталі для большэвікоў Меншчыны асновай барацьбы за большэвіцкія калгасы і заможных калгаснікаў. Рашаючую ролю ў рэалізацыі гэтага лозунга тав. СТАЛІНА адыгралі створаныя партыяй палітаддзелы МТС і соўгасаў.

80 проц. усёй пасеўнай плошчы Менскага раёна абяднаны ў сацыялістычным сектары. У параўнанні з мінулым годам пасеўная плошча раёна ўзрасла на 2.022 гектара за лік асваення бросавых зямель.

Перамагаючы супраціўленне нац дэмаўскіх і кулацкіх элементаў, партарганізацыя дабілася пашырэння плошчы збожжавых культур, пры адначасовым пашырэнні плошчы гародніны і бульбы. Не меншых поспехаў Менскі раён дабіўся і ў стварэнні кармовай базы для разгортвання сацыялістычнай жывёлагадоўлі.

Лозунг тав. СТАЛІНА аб калгаснай заможнасці згуртаваў вакол вясковых партарганізацый асноўныя масы калгаснікаў на барацьбу за высокі ўраджай.

За сумленную працу, за сумленныя адносіны да калгаснай маемасці зямля шчодра адплаціла калгаснікам. Замест 7 цэнтн. жыта з гектара ў мінулым годзе, сёлета мы мелі 10,4 цэнт. замест 5,5 цэнт. аўса, сёлета сабралі 9,1 цэнт. Значна павялічыўся ўраджай бульбы, падвоіўся ўраджай корань плодаў.

Фарсаванне развіцця жывёлагадоўлі ў раёне было адным з важнейшых мерапрыемстваў партарганізацыі. Галоўная ўвага была накіравана на развіццё малочна-таварных і свінагадоўчых ферм. На 1-е кастрычніка 1933 года на Меншчыне ўжо налічвалася 90 малочных таварных ферм з паталоўем у 7.454 шт. За мінулы год колькасць рагатай жывёлы ў калгасах, у калгаснікаў і аднаасобнікаў узрасла з 17.114 шт. да 17.845 штук. Колькасць свіней павялічылася з 15.422 шт. да 16.838 шт. У калгасных формах сканцэнтравана 57 проц. буйнай рагатай жывёлы і 40 проц. свіней.

У гэтым годзе значна ўзмацніла ся кармовая база. План сіласавання выкананы на 100 проц.

Закон аб цвёрдых пастаўках с.-г. прадуктаў, арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаванне калгасаў, перабудова партыйна-масавай работы, аказалі вялікі ўплыў на выкананне абавязацельстваў перад дзяржавай.

Планы збожжа і бульбапаставак былі выкананы Менскім раёнам датэрмінова, на два месяцы раней чым летась. Пролетарскі Менск атрымаў у гэтым годзе ад сельскай гаспадаркі раёна малочных прадуктаў на 74 проц. больш у параўнанні з мінулым годам. Калгасна-таварныя фермы выканалі план задачы малака на 135 проц.

Атрыманыя поспехі мелі свой непасрэдны адбітак на росце калгаснай заможнасці. Вага калгаснага прыпадзіна падвоілася. Калгаснікі-ўдарнікі ўжо ў гэтым годзе становяцца заможнымі.

Калгаснік ЕРМАЛОВІЧ МІХАІЛ (калгас «Першая конная»). Н.-Дворскага с.-с., разам з жонкай за дзесяць месяцаў зарабіў 700 працадзён, за што атрымаў 270 пуд. збожжавых, 725 пуд. бульбы, 1600 руб. грашыма.

Калгаснік ШКОР МІХАІЛ (калгас «Труцавік, Кайкаўскага сельсавета) з двума братамі выпрацавалі 700 працадзён. Яны атрымалі 230 пуд. збожжавых, 430 пуд. бульбы.

Калгаснік ЧАРНЯК (калгас імя Варашылава, Абчацкага сельсовета) зарабіў 722 працадні і атрымаў 135 пуд. збожжавых і 650 пуд. бульбы. А такіх у раёне шмала.

Вынікі сельска-гаспадарчага года ўзяўляюцца лепшымі показальнікамі большэвіцкага кіраўніцтва менскага гарадскога камітэта.

Але мы павінны памятаць, што, дабіўшыся раду поспехаў у паляводстве, мы ўсё-ж адстаем на такім важнейшым участку як жывёлагадоўля. Мы яшчэ не навучыліся як след абыходзіцца з машынамі. У нас наперадзе вялікія задачы ў галіне палітычнага, культурнага выхавання мас і паглыблення ўсёй работы ў вёсцы. Наперадзе ў нас вялікая колькасць задач, так яркаакрэсленых у тэзісах да XXII з'езда.

Узмацненнем класавай пільнасці ўсёй партарганізацыі, асабліва на вёсцы, павышэннем адказнасці кожнага комуніста за даручаную яму партыяй справу, канкрэтным аперацыйным кіраўніцтвам на ўсіх участках калгаснай вытворчасці — Менская партарганізацыя сустрэне з'езды нашай партыі новымі перамогамі ў барацьбе за яшчэ больш высокі ўраджай будучага года.

Г. Б.

ЗАГУДУЦЬ ТУРЫНЫ ЦЭЦ

Рабочыя менскай электрастанцыі жартаўліва называюць гэтыя катлы «губернатарскімі». Старыя, пяцграбныя катлы, прымітыўныя, уродлівыя машыны, дапасаваныя выключна да апала нафтай — незайдросную электрыфікацыйную спадчыну пакінуў губернатарска-архіерэйскі Менск працоўным чырвонай сталіцы БССР! Да Окцябрскай рэвалюцыі электраэнергіі хапала тут хіба на асвятленне цэнтра. Камароўка, Ляхаўка, Серабранка марнелі ў газавым смуродзе глухога правінцыяльнага гарадка. Славутыя 2-3 заводы зельтэрскіх вод, аразумела, не патрабавалі магутнага электрычнага тока, і «губернатарскія» катлы ціха і мірна выконвалі свае абавязкі...

Пасля Окцябра на менскай электрастанцыі з'явіўся пасціжыдзідравы дызель, з'явіліся турбіны Машіна і Метра-Вікерса, у справу пашлі і нафта, і торф і дровы — магутнасць станцыі даведзена да 7500 кілават-гадзін. Але пульс новых фабрык і заводаў, рост комунальна-жыллёвага будаўніцтва, шпаркае ператварэнне Менска з адсталага губернскага асяродка ў перадавы сацыялістычны горад патрабуюць большага.

І сёння ў раёне Ляхаўкі, той самай Ляхаўкі, што славілася калісці пажаўтчынай, шалтаем і п'яными дэбошамі, а пяпер з'яўляецца перадавым прамысловым раёнам, даўно звязаным з цэтрам тэмпайным рухам,—заканчваюцца мантажныя работы на цёплаэлектрацэнтралі агульнай магутнасцю ў 22 тысячы кілават-гадзін. Гэтая цёплаэлектрацэнтраль сапраўды з'яўляецца лепшым падарункам Менска 15 з'езду КП(б)Б!

Фактычная дата пачатка будаўніцтва ЦЭЦ — 5 ліпеня 1933 года. На працягу двух напярэдніх месяцаў пустыр на ўзбярэжжы Свіслачы запаўняўся бетонам, пэтлай, будаўнічым лесаматэрыялам.

Першыя крокі будаўніцтва ЦЭЦ былі цяжкія і марудныя. Чыстку парт'ячэйка ЦЭЦ сустрэла з вялікімі прарывамі. Нязначная частка брыгад і паасобных рабочых выконвала свае дзённыя заданні. Не хапала рабочай сілы; з патрэбных на будаўніцтве 800 рабочых было ў наяўнасці толькі 400 чалавек.

Прагулы, спазненні на работу лічыліся на ЦЭЦ звычайным з'явішчам, прычым з прагульшчыкамі не вялося амаль ніякай барацьбы.

Само будаўніцтва ЦЭЦ уяўляла сабой своеасаблівы прахадны двор. І сёння рабочыя цэлымі групамі пакідалі будаўніцтва. Цякучасць перавышала 100 проц. У ліпені, напрыклад, было прынята 443 рабочых, а кінула ЦЭЦ — 448.

Матэрыяльна - бытавое абслугоўванне рабочых было самым вузкім месцам. Не хапала жыллёвай плошчы для сезоннікаў: з 1000 рабочых было задаволена кватэрамі ўсяго 260 чалавек. Сярод рабочых зусім адсутнічала палітыко-масавая і культурна-выхаўчая работа. Як вынік — соцспаборніцтва і ўдарніцтва на будоўлі разгорнута не было. Усе гэтыя «якасці», бясспрэчна, перашкаджалі паспяховаму ходу будаўніцтва, зніжалі тэмпы яго.

У жніўні мінулага года праводзілася чыстка партыйнай арганізацыі ЦЭЦ. Камісія па чыстцы прыйшла да вывада, што кіраўніцтва парт'ячэйкі паздольна забяспечыць далейшае нарастанне тэмпаў ударнага будаўніцтва. Настановай камісіі бюро ячэйкі было распушчана.

Вывады камісіі па чыстцы з'явіліся практычнай праграмай перабудовы ўсёй работы на ЦЭЦ.

— Новаму кіраўніцтву, — гаварыць цяперашні сакратар парт'ячэйкі тав. **Варно**, — астаўся нераспаханым край работы. Але, паколькі партыя абавязала нас забяспечыць пуск ЦЭЦ у тэрмін мы, закасаўшы рукавы, з большэвіцкай настойлівасцю і энергіяй узяліся за перабудову ўсіх галін работы.

Перш за ўсё мы ўзяліся за правільную расстаноўку сіл. Кіраўніцтва асноўнымі ўчасткамі даручылі праверэным, лепшым ударнікам-рабочым.

Палепшанне матэрыяльна - бытавога і культурнага абслугоўвання рабочых было пакладзена ў аснову работы. Разгорнутыя самазагатоўкі, выдалене дармаедаў са сталовай і ЗРК, устанаўленне пазменнай чарговасці ў часе абеда, ператварылі сталовую ў сапраўдны ўдарны цэх. Кошт абедаў з 70-90 кап. знізіўся да 50-55 кап., палепшылася якасць абедаў.

Комсамольцы ўзялі шэфства над рабочымі баракамі і інтэрнатамі. І яно дало рэальныя вынікі. Інтэрнаты ў поўнай меры прыстасаваны да зімы. У іх зараз цёпла, светла і чыста. Інтэрнат перавораны у месца культурнага жыцця і адпачынку рабочых.

Рэалізацыя ўказанняў камісіі па чыстцы падвоіла тэмпы работы на ўсіх участках будаўніцтва ЦЭЦ.

Так, перад Окцябрскімі святамі быў абвешчан конкурс на лепшыя вытворчыя показальнікі. Кожная брыгада, кожны рабочы, дзе-б ён не працаваў, узяў на сябе канкрэтныя абавязацельствы. Сістэматычная праверка партарганізацыяй іх выканання дала вынікі. Комуністы, комсамольцы сапраўды занялі зараз авангардную ролю на будаўніцтве. Партарганізатары: **ДЗЕМІДАЎ, БУЗІН, МАЦАНКА, РУТЭНБЕРГ** па-большэвіцку мабілізуюць рабочых на ударнае будаўніцтва ЦЭЦ. Стопроцантнае выкананне задання не задавальняе зараз большасць брыгад і рабочых. Яны змагаюцца за вышэйшыя показальнікі! Комсамольская брыгада **ОРКІНАЙ** выконвае сваё дзённае заданне не менш як на 150 проц., брыгада **ШУЦІКА** — на 145 процантаў, **АБРАМОВІЧА** — на 114, **МУЛЕРА** — на 161 процант.

Рэзкі пералом ва ўсім хоце гэтага адказнейшага будаўніцтва даў заклік нашага сакратара ЦК КП(б)Б тав. **ГІКАЛО** да менскай комсамоліі. «ЦК спадзяецца, — казаў тав. Гікало, — што ленінскі комсамол, арганізатар маладых байцоў за справу індустрыялізацыі нашай краіны, які з'яўляецца на праву шэфам электрыфікацыі, зараз-жа па-большэвіцку мабілізуе сябе на справу будаўніцтва ЦЭЦ».

— Аксамсаміоць будаўніцтва! — адказалі на зварот тав. Гікало менскія комсамольцы, — прарэзаць яго маладосцю, напорнасцю, непахіснай верай у канчатковую перамогу! Дабіцца пуска цёплаэлектрацэнтралі ў вызначаны партыяй і ўрадам тэрмін!

І на Ляхаўку, на ўзбярэжжа Свіслачы, на зусім новую справу пашлі — гарбары, краўцы, абутнікі, друкары, штотачнікі, пашкі маладыя ўдарнікі «Большэвіка», «Комунара», друкарні імя Сталіна, фабрыкі «Окцябр»...

Былі дні надзвычайнай напружанасці, знясілля і амаль роспачы. Трэба разумець, што на сырую глыбу ў непагодзь, у якасці звычайных чорнарабочых прышла даволі кваліфікаваная рабочая сіла з добра-абсталяваных фабрык і заводаў, дзе ўмовы працы былі непараўнальна лепшыя. І тым не менш цёплаэлектрацэнтраль, уся комсамольская арганізацыя Менска, уся наша рабочая моладзь ведае дзесяткі і сотні комсамольцаў, якія показалі сябе лепшымі ўдарнікамі і на гэтым участку соцыялістычнага будаўніцтва.

ЦЭЦ вялае комсамольцаў-брыгадзіраў **Шуціка, Вайчка, Адамовіча**, вялае комсамолку **МАЛІНОЎСКУЮ, ІУКОВІЧА, ШАХВЕРДЗЯНА** і іншых, і іншых.

Показальна ў гэтым сэнсе постаць **МАРЫЛІ МАЛІНОЎСКАЙ** — брыгадзіршы чорнарабочых. У брыгадзе Марылі не ведаюць прагулаў або спазненняў. Не глядзячы на суровае надвор'е, дрэнны абутак, розныя недахваты — яе работа кіпіць, лоўніца заўзятым імкненнем сваячасова даць бетэннішчыкам бетон, абмуроўшчыкам — цэглу.

Быў выпадак, калі ў Малінаўскай памірала маці. Трэба было пайсці з будаўніцтва — але ў напружаны час ярасных тэмпаў, гераічнай барацьбы, пажінуць — гэта значыць здраваць, не выканаць абяцанне, дадзенае комсамольскаму калектыву пры мабілізацыі на ЦЭЦ. І Марыля Малінаўская заставалася на сваім посту!

Увесь час брыгада дзяўчат на чале з брыгадзіршай Марылай працуе на падносцы матэрыялаў. У гэтай брыгадзе — свае законы! Марыля не дае загадаў, не крычыць, не ласца, а работа ідзе дружна і плённа. Марылю дзяўчаты разумеюць без слоў. Яна ўласным прыкладам вядзе за сабой усю брыгаду падносчыц.

На канале, на абмуроўцы, на абледзенелых мастках рыштаванняў, на шахтападъёмніка ўзнімалі комсамольцы выкананне плана да 160-180 проц. І дзелавітай упартасцю, адчуваннем з юнацкай жаданасцю, крылатымі надзеямі і ўдзьмам, яны зарабілі сабе ганаровае імя «ніжаўцаў».

Характэрна: цэнтр на ЦЭЦ. І зноў жа па-за яе кампусамі, комсамолец-ударнік гэта гікалавец!

Будаўніцтва сапраўды стала комсамольскім (на ім — 280 комсамольцаў з якіх 140 замацаваліся за ЦЭЦ і на час экспрэтацыі, пасля закончэння мантажных работ).

Трэба адзначыць, што яму аддалі і аддаюць вялікую ўвагу і гарком і ЦК ЛКСМБ.

Вялікім дасягненнем ў будаўніцтве, апрыдзенымі за апошнія месяцы, цёплаэлектрацэнтраль абавязана, у першую чаргу, пастаянному непасрэднему кіраўніцтву і дапамозе асобіста тав. Гікало, які жывацікавіцца ходам будоўлі, уважаліць ва ўсе дэталі яе, дамагаецца палепшанага харчавання рабочых, своечасовага забеспячэння матэрыяламі і т. д.

Шмат дэтамос у фасаванні будаўніцтва ЦЭЦ падшэфны авіятарам. Часта ў вышыні пад ЦЭЦ батэра гулкі маторы самалётаў, заклікаючы рабочых да новых перамог. Самалёты пакідаюць на тэрыторыі спецыяльныя аловы да рабочых, якія ўзалі аб неабходнасці тэрмінова здаць у эксплуатацыю ЦЭЦ.

Такія-ж адказы спускаліся на заводы, якія выконвалі для ЦЭЦ розныя заказы.

XV з'езд КП(б)Б і XVII з'езд ВКП(б), рабочыя будаўніцтва ЦЭЦ сустракаюць не толькі пускам у эксплуатацыю першай чаргі, але і поўнай ліквідацыяй неграматнасці сярод рабочых. На будаўніцтве добра працуюць беларуская і украінская школы малапісьменных.

Вучэбны дапрызыўны пункт падрыхтаваў з'ездам партыі паўтарэнта 31 чалавек варашылаўскіх стрэлкоў.

Да вечара, які прысвячаецца пуску ЦЭЦ, рабочыя падрыхтавалі выступленне ўдзельніка харашога гурэка і духавога аркестра.

Сёння — пробны пуск, іспыт катлоў. У дзень адкрыцця XV з'езда КП(б)Б, на змену «губернатарскім» — поўнымі групамі ўдзельнічаць новыя катлы, загудуць турбіны будаўніцтва першай чаргі чыстай магутнасці цёплаэлектрацэнтралі.

Юр. ЛЯВОННЫ,
М. НІКІЦІН.

Зверху згульны від ЦЭЦ. НА ЗДЫМКАХ — Начальнік будаўніцтва т. Сцешэнка; інжынер т. Шмараў; сакратар парт'ячэйкі т. Варно, майстар кацельнага і т. Дземідаў; брыгадзір комсамольскай брыгады Кунарака, брыгадзір брыгады цесляроў Арцюха.

НА РАЙПАРТКАНФЕРЭНЦЫЯХ

МАГІЛЕЎ

(Ад нашага спец. карэспандэнта).

10 студзеня а 7 гадзіне ўвечары адкрываецца раённая партканферэнцыя. Зал Магілеўскага дзяржаўнага тэатра перапоўнен. На сцэне сакратар ЦК КП(б)Б т. Жэброўскі, сакратар райкома т. Равінскі. Занавес адкрываецца. Зала ўзрываецца гучнымі апладысментамі і воклічамі «Гэй, хай жыве т. Сталін, няхай жыве ЦК ВКП(б)».

Па прапанове дэлегацый пісталкавай фабрыкі, Чырвонай арміі, чыгуначнікаў абіраецца прэзідыум у складзе 35 чал. і ганаровы прэзідыум у складзе т. т. Сталіна, Кагановіча, Молатова, Варашылава, Калініна, Орджанікідзе, Куйбышава, Кірава, Касіора, Андрэева, Постышэва, Рудзутака, Гікало, Тэльмана, Ленскага, Корчыжа, Дзімітрава.

Пасля выбараў кіруючых органаў канферэнцыі з дакладам ЦК КП(б)Б выступіў сакратар ЦК т. Жэброўскі.

Даклад т. Жэброўскага не раз перарываецца гучнымі апладысментамі. Пасля даклада канферэнцыя паслала прывітальныя тэлеграмы т. Сталіну, ЦО ВКП(б) «Правда», ЦК КП(б)Б т. Гікало і ЦО КП(б)Б «Звяздзе».

БАБРУЙСК

10. (Па тэлефону ад наш. кар.).

Раённае пасяджэнне райпартканферэнцыі было прысвечана справаздачам па дакладу ЦК КП(б)Б, які ўчора зрабіў тав. Лычоў. Выступаючыя ў спрэчках дэлегаты адзначылі агра масвейшыя поспехі ў КП(б)Б, як рэзультат большэвіцкага кіраўніцтва ЦК на чале з тав. Гікало. У выступленнях таварышы крытыкавалі ўласныя недахопы. Тав. Шэйчук указаў на цэлы рад агідлнасцяй на лесакамбінаце, якія тармозяць выкананне прамфінплана.

Канферэнцыю вітала дэлегацыя лепшых калгаснікаў зоны дзейнасці Цалуцкай МТС. У складзе дэлегацыі былі лепшыя калгаснікі - ударнікі калгаса «Пастыван». Калгаснікі расказалі канферэнцыі, як у рэзультаце ажыццяўлення ўказанняў тав. Сталіна калгасы пад кіраўніцтвам політадзела МТС становяцца большавіцкімі, а калгаснікі заможнымі.

— Заклінаем мы, — гаворыць калгаснік Шчыгроў, — да культурнага росту, праводзім культпаход, працуюць розныя гурткі.

Калгаснікі прад'явілі рахунак капітацыі, якая яшчэ драпна забяспечвае штодзённыя патрэбы калгаснікаў і калгасных гаспадарак.

Канферэнцыі рапартавалі ўдарнікі бабруйскіх прадпрыемстваў.

ПОЛАЦК

10-I. (Ад нашага спец. карэспандэнта).

Сёння адкрылася 3-я раённая партканферэнцыя Полаччыны. Адкрываючы канферэнцыю, сакратар райкома тав. Турпай застанавіўся на дасягненнях Полацкага раёна за перыяд ад 2-й да 3-й партканферэнцыі. Полацкі раён, які знаходзіцца на мяжы, за апошні год пры непасрэдным кіраўніцтве ЦК КП(б)Б на чале з тав. Гікало прыходзіць да сваёй 3-й партыйнай канферэнцыі, пасіяхова закончыўшы с.-г. 1933 год.

Канферэнцыя пілала прывітальныя тэлеграмы ЦВКП(б) і т. Сталіну, ЦК КП(б)Б і т. Гікало. Пасля прыняцця прывітальных тэлеграм з дакладам аб рабоце ЦК КП(б)Б за перыяд ад XIV зала да XV з'езда КП(б)Б выступіў член бюро ЦК КП(б)Б тав. Кавьчук.

СЛУЦК

(Па тэлефону ад нашага спец. карэспандэнта).

10 студзеня на раённым пасяджэнні Слуцкая райпартканферэнцыя заслухала справаздачны даклад сакратара РК КП(б)Б тав. Крацэра.

— Раённы камітэт,—гаворыць тав. Крацэр,—у цэнтры сваёй штодзённай работы ставіў пытанне арганізацыйна-гаспадарчага ўмацавання калгасаў, перапрацэнка соўгасаў раёна ў сапраўдныя прадпрыемствы буйнога соцыялістычнага земляробства і жывёлагадоўлі.

Раённая партарганізацыя пад непасрэдным кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б дабілася поспехаў у калгасным будаўніцтве, у выкананні асноўных с.-г. кампаній (пасеўная, уборачная кампанія выкананне абавязкаў перад дзяржавай). Разам з гэтым узрасці амаль у два разы прыбыткі калгаснікаў. Зусім нездавальняюча парганізацыя кіравання соўгасамі. Адной з непрашчальных памылак парт арганізацыі з'яўляецца аслабленне класавай пільнасці, асабліва ў правядзенні ленінскай нацыянальнай палітыкі на фронце нацыянальна-культурнага будаўніцтва. Была асабліва барацьба з контрраволюцыйным нацыянал-дэмакратызмам. Раённым камітэтам на дапамозе Цэнтральнага Камітэта партыі за апошні час праведзена вялікая работа па выпраўленню апушчаных памылак, па ўзмацненню партыйнага кіраўніцтва нацыянальна-культурным будаўніцтвам.

Для поўнага жанання ільназагатовак і лесавывазі раённая партканферэнцыя мабілізавала ўсіх комуністаў адстаючых сельскіх саветаў і абавязала іх давіць работы канферэнцыі поўнаю выканаць ільназагатоўкі і лесавазку.

Канферэнцыю тэлі некалькі дэлегацый ваенных сцей, якія рапартавалі аб сваіх дасягненнях у баявой і палітычнай прыхтоўцы. Таксама віталі дэлегацыі перадавых польскіх сельсоветаў, дагацыя настаўніцтва раёна. Канферэнцыя заслухала надзвычай цікі рапарт юных піонераў-школьнікаў, якія жыва прадэманстравалі сі школьныя піонерскія поспехі.

На вячэрнім пасяджэнні заслухан даклад рэвізійнай камісіі і справаздача РКК РСІ. Пасля гэтых дакладаў прадаюцца спрэчкі па дакладах РК і кантрольнай камісіі.

Паляшчук.

ВЫСОКАЯКАСНА АДРАМАНТАВАНАМУ ТРАКТАРУ—УМЕЛАГА ВАДЗІЦЕЛЯ

ПАДРЫХТОЎКУ ТРАКТАРЫСТАЎ АДКЛАДАЮЦЬ ДА ВЯСНЫ

ЛЕПЕЛЬ. (Наш спецкар.).

Не толькі ўмець кіраваць машынай, але ведаць кожны яе шрубік, кожную дэталь, кожны капрыз машыны. Такія патрабаванні прад'яўляюцца да трактарыста.

Ці адпавядаюць нашы кадры трактарыстаў гэтаму патрабаванню? Праверка, праведзеная нядаўна па Лепельскай МТС, паказала, што каля паловы трактарыстаў нездавальняюча ведаюць машыну, не аўладалі яшчэ тэхнікай, ім нельга даверыць трактар.

«Павінен прайсці перакваліфікацыю» — такую характарыстыку можна часта сустрэць у актах праверачнай камісіі. Зразумела чаму пераважная большасць трактараў Лепельскай МТС патрабуе капітальнага рамонта.

Некалькі лічбаў. Прастоі трактараў па МТС у гэтым годзе прынялі вялікія размеры. У жніўні машыны «Ф. П.» прастаялі каля 16 тыс. трактара-гадзін. У лістападзе машыны «Ф. П.» прастаялі каля 20 тыс. трактара-гадзін.

План узняцця папараў выканан трактарным паркам толькі на 40 проц., план па зяблеву на 52 проц. Зусім сарвана заданне па асенняй сэўбе.

Адна з прычын гэтага — частыя паломкі машын, выкліканы нізкай кваліфікацыяй трактарыстаў. Былі з выпадкі паломкі каленчатых валаў, у прыватнасці на палянокім участку (трактарыст АКУЛЕВІЧ). У атрадзе № 2 брыгадзір ПЕТРЫШЧ і трактарыст ГАМЗЮК замарозілі машыны: завялі трактар, нагрэлі, а потым налілі вады.

У калгасе «Авангард», Несінскага сельсовета, трактарысты больш тыдня капаліся ў машыне, ніяк не маглі завесці трактар, і нарэшце даставілі яго ў МТМ на рамонт.

На Прудокскім участку трактарыст так «лоўка» кіраваў машынай, што заехаў на хату калгасніка. Псавалі машыну брыгадзір ПАРФЕНЧУК і трактарысты КАЗЛОЎ і УСАВІК (Воранскі ўчастак).

Можна прывесці яшчэ факты, якія ілюструюць няведанне некаторымі трактарыстамі даручанай ім адказнай справы. Мы не гаворым тут аб выпадках шкодніцтва, выкрытых політадзелам МТС.

Дрэнна стаіць справа па МТС з расходаваннем гаручага. Пры норме 1.511 цэнт. выдаткавана 1.624. Асабліва многа гаручага перавыдаткавана па Воранскім участку (загадчык участка ТІХОЦЬКА і брыгадзір ПАРФЕНЧУК) — звыш 17-20 проц. Разбазарвалі гаручае і на Палянскім участку (т. т. ВЯЧЭРСКІ і ЖЭРНАСЕК) — 8,5 проц. звыш нормы. Толькі васьмая брыгада (брыгадзір БАРАНАЎ, трактарыст АУТУХОЎ) дабілася эканоміі 10 цэнт. гаручага.

І тут асабліва адмоўны ўплыў аказала нізкая кваліфікацыя работнікаў трактарнага парка, не праяўляючых уважлівых і беражлівых адносін да даверанай ім машыны.

План зімовай вучобы таварыщы: трэба перакваліфікаваць 30 чал. і падрыхтаваць 80 новых трактарыстаў. Для перакваліфікацыі пакуль нічога не зроблена. Ведзь толькі наметкі таго, што трэба зрабіць.

Падрыхтоўка новых кадраў яшчэ не пачыналася і ўвесь час адцягваецца. Павінны былі пачаць заняткі 15 лістапада, потым адцягнулі да 1 снежня. Прайшоў месяц — становішча ранейшае. Задрымлівае эдсутнасць памяшканняў для заняткаў і інтэрната. Курсы поўнасцю не ўкамплектаваны. Не загатоўлены яшчэ пасцельныя прыналежнасці.

Ільнатрактарацэнтр прыслаў спачатку план — падрыхтаваць 30 чалавек, потым даў дадатковае заданне — падрыхтаваць 50 трактарыстаў для новай МТС, якая павінна быць арганізавана ў Лепельскім раёне. Змяненне плана, значна перашкодзіла ўсёй работе.

Трэба камплектаваць курсы калгаснікамі з сельсоветаў раёна дзейнасці будучай МТС. Але, як гэта зробіць, калі яшчэ невядома, якія сельсоветы і калгасы будзе абслугоўваць новая станцыя.

З вялікім спазненнем прысланы праграмы заняткаў. Ільнатрактарацэнтр не прыслаў падручнікаў, асігнаваны толькі сродкі для набыцця іх.

Дагэтуль не вырашана пытанне аб харчаванні трактарыстаў. Калгасы павінны снабжаць прадуктамі калгаснікаў, камандыраваных імі на курсы. Але ў якіх размерах, па якому прынцыпу — невядома. Амаль нічога не зроблена, каб арганізаваць грамадскае харчаванне — ёсць яшчэ блытаніна ў пытаннях, як стымуляваць паспяховасць курсантаў.

Такое становішча з падрыхтоўкай трактарыстаў стварае пагрозу, што машыны зноў трапяць у рукі непадрыхтаваных, малакваліфікаваных людзей.

Лепельская МТС павінна неадкладна разгарнуць зімовую вучобу трактарыстаў, не адкладваць гэту справу да вясны, дабіцца, каб кожны трактарыст, скончыўшы курсы, дакладна ведаў машыну і аўладаў яе тэхнікай.

Б—оў.

Увага калгаснаму кавалю

БАБРУЙСК. (Наш кар.). Кузня ў калгасе мае вялікае вытворчае значэнне. Каваль скрозь ды ўсюды з'яўляецца самым высокакваліфікаваным работнікам у калгасе. На яго плячах ляжыць адказнасць за спраўнасць машыннага парка калгаса. І вось наперакор гэтай фактычнай высокай ролі каваля і кузні, яны яшчэ не атрымалі прызнання з боку многіх кіраўнікоў калгасаў.

Каваль калгаса «ПОЛЫМЯ КОМУНІЗМА» Ляпіч, як кажуць, «майстра на ўсе рукі». Ён выконвае любую кавальскую і слясарную работу, пачынаючы ад накладання парога да простага плуга і да складанага рамонта жнівяркі. У Ляпіча заўсёды спраўны інвентар і машыны. Ён ужо канчае рамонт палявога інвентара да надыходзячай вясны (плугі, бораны, калёсы). Акрамя гэтага Ляпіч сам заработаў для калгаса 2.500 руб.

За год напружанай працы ў кузні Ляпіч атрымаў 260 працадзён. Вартаўнік Яўхім за тое, што пашпацыруе ноч каля будынкаў, зарабіў 300 працадзён. Праўленне калгаса каваля Ляпіча вызначыла месячны «аклад» у 20 працадзён, а вартаўніку 30 працадзён. З наступленнем зімы Яўхіму надбавілі яшчэ 25 сотак працадня і ён зараз кожную ноч выкачвае 1,25 працадня (37 працадзён у месяц), а каваля Ляпіча вызначылі на месяц... 10 працадзён.

— Дык якая-ж мне радасць пачыся каля горна, есці сажу, пыл, паліць сваю вопратку, калі я магу менш працаваць і больш атрымліваць?—пытае Ляпіч і правільна ставіць пытанне аб пераводзе на здзельшчыну.

— За такія разважанні выганім з калгаса—пагражае Ляпічу старшыня калгаса Царык.

Зямельныя органы да гэтага часу не думалі аб тым, каб увесці здзельшчыну ў кавальскую работу. Рэдка дзе калгаснаму кавалю створаны належныя ўмовы для працы. У рэзультаце кавалі кідаюць кузні і бягуць на іншыя больш удзячныя работы, а калгасны інвентар застаецца неадрамантаваным і хутка выходзіць са строя.

***

На нарадзе прысутнічала 40 калгасных кавалёў, якія абмяняліся вопытам сваёй працы. Каваль з коммуны ІМЯ ВАРОЎСКАГА т. МАНЦЭВІЧ расказаў на нарадзе, як ён дабіўся бесперабойнай работы жнівярак. Каваль з калгаса «КАЧЭРЫЧЫ» падзяліўся сваім вопытам аперацыйнай работы паходнай кузні прама ў брыгадзе.

Кавалі абавязаліся ў гонар XVII з'езда ВКП(б) сваячасова закончыць рамонт палявога сельса-гаспадарчага інвентара, даць высокую якасць рамонта.

Пакончыць са злачынкымі адносінамі да лесавывазкі

Адной з асноўных прычын невыканання большасцю леспрамгасаў плана лесазагатовак і лесавывазкі з'яўляецца поўнае ігнараванне гэтай справы з боку многіх САКРАТАРОЎ РК КП(б)Б, СТАРШЫНЬ РВК І СТАРШЫНЬ РАЙПРАФСОВЕТАЎ. Важнейшая, палітычная і гаспадарчая справа пушчана на САМАЦЁК. Многія сакратары райкомаў і старшыні РВК нават не цікавяцца загатоўкай і вывазкай леса і дроў.

Запытайце, напрыклад, старшыню СІРОЦІНСКАГА РВК тав. САМУСЕВІЧА, ён вам адкажа «ў парадку самакрытыкі», што з лесазагатоўкамі і вывазкай абстаіць не важка, але канкрэтных лічбаў і фактаў, характарызуючых становішча, ён не ведае. Колькі фурманак занята на вывазцы? Дакладна адказаць на гэта пытанне тав. САМУСЕВІЧ не можа, але з агаворкай «арыентыровачна», «прыблізна» ён адважваецца назваць лічбу 3.000. Гэта лічба аказваецца перапавялічанай не на многа, усяго толькі... У ДЗЕСЯЦЬ РАЗ.

— За апошнія дні, — кажа далей тав. САМУСЕВІЧ, — ёсць эрух... Раённае кіраўніцтва прымае захады да фарсавання лесавывазкі...

Аб «эруху» красамоўна кажуць вынікі першай пяцідзённкі студзеня: вывезена лесаматэрыялаў 10,4 проц. дзяднага задання (417 кбм.), дроў—45,9 проц. (1.377 кбм.).

Работнік леспрамгаса пажадаў даведацца ў намесніка старшыні сіроцінскага РВК тав. МАЛАШОНКА, як рэалізуецца дырэктыўная тэлеграма тав. ГАЛАДЗЕДА. Тав. Малашонак адказаў:

«ШТО МЫ РОБІМ — ГЭТА НАША СПРАВА, А ВОСЬ ШТО ВЫ РОБІЦЕ?...»

Па адказу відаць, што тав. Малашонку не было чым пахваліцца...

Сакратара Сіроцінскага райкома партыі тав. МІРОНЕНКА лесавывазка таксама цікавіць, як леташні снег. Леспрамгас ва ўялення райкома з'яўляецца ўстановай, забяспечваючай не песам і дровамі, а людзьмі для розных кампаній. І зараз, у самы разгар работы, сакратар парт'ячэйкі леспрамгаса тав. ЭРДМАН, ён-жа адказны ПА АДДЗЕЛУ ПРАЦЫ, мабілізаваны райкомам у якасці папіўрука на асоавіяхімаўскі збор. Мабілізавалі на нейкую кампанію і старшыню рабочкома леспрамгаса, «Трыкутнік» застаўся ў адной асобе дырэктара, да таго-ж нядаўна назначанага на гэты пост.

У сярэдзіне снежня на пленуме ЗАРАНОЎСКАГА сельсовета, на якім прысутнічаў сакратар сіроцінскага райкома тав. МІРОНЕНКА, стаяў рад пытанняў, А АБ ВЫВАЗЦЫ ЛЕСА ЗАБЫЛІ І толькі па настаянню работніка леспрамгаса пытанне паставілі ў «бягучых справах» і зразумела змазалі.

Наогул, на пленумах сельсоветаў і на пасяджэннях прэзідыумаў пытанне аб лесавывазцы ставіцца вельмі рэдка. Між тым, рад сельсоветаў (ПОЎЖАНСКІ, СПАСКІ, БАРАНКАЎСКІ, ДАБЕЙСКІ, ОБЛЬСКІ і інш.) яўна сабатуюць лесавывазку. І сабатуюць таму, што РАЁННАЕ КІРАЎНІЦТВА ГЛЯДЗІЦЬ НА ГЭТА СКРОЗЬ ПАЛЬЦЫ. Старшыня БІКЛАЖАНСКАГА сельсовета так і тлумачыць сваю бяздзейнасць.

— РАЁН ЗА НАС НЕ БРАЎСЯ, ЯК НАЛЕЖЫЦЬ...

Гэта правільна! Райком і РВК мала турбуюцца аб тым, што дагаворная кампанія праведзена толькі напалову, што многія сельсоветы адмаўляюцца заключаць дагаворы да таго часу, пакуль не закончаць выкананне снежаньскага задання. Раённае кіраўніцтва мала турбуецца аб тым, што сіроцінскі леспрамгас мае ТРОХМЕСЯЧНУЮ ЗАПАЗЫЧАНАСЦЬ ПА ЗАРПЛАЦЕ на суму 80 тыс. руб. і што гэта акалічнасць можа зусім сарваць зімовую кампанію. Грошы ў банку на бягучым рахунку леспрамгаса ёсць, але банк не выдае, а райком партыі бяссільны дапамагчы.

Сіроцінскі леспрамгас з 10 снежня зліўся з бешанковіцкім. Ён зараз носіць падвойнае імя: Сіроцінска-бешанковіцкі леспрамгас. Але тое, што кантора леспрамгаса знаходзіцца ў Сіроціне, дае повад бешанковіцкаму раённаму кіраўніцтву зусім забыць аб дзесятках тысяч кубаметраў леса і дроў, якія ляжаць на падпарадкаванай ім тэрыторыі. Сакратар бешанковіцкага райкома КП(б)Б тав. КАЖДАН на ўсе напамінанні аб лесе і дровах адказвае:

«У МЯНЕ ЗАРАЗ ЛЁН, А ДРОВАМІ ЗАЙМАЦЦА НЯМА ЧАСУ...»

Відаць і з ільном не важна (64 проц. на 5 студзеня) таму, што адзіным метадам у рабоце бешанковіцкага райкома з'яўляецца метад ЧАРГОВАСЦІ.

Бешанковіцкі РВК прытрымліваецца тых-жа поглядаў. Рад сельсоветаў (АСТРОВЕНСКІ, ГАНКАЎСКІ, НОВІКАЎСКІ, ПАЖАРЫШЧАНСКІ, БЕШАНКОВІЦКІ, ПЯЦІГОРСКІ і інш.) зрываюць лесавывазкі, а РВК пальцам аб палец не ўдорыў, каб прымусіць гэтыя сельсоветы выканаць дырэктывы партыі.

Адзіной уцехай для Сіроцінскага і бешанковіцкага кіраўніцтва можа служыць толькі тое, што яны НЕ АДЗІНЫЯ.

Такой-жа тактыкі чарговасці прытрымліваюцца кіраўнікі СУРАСКАГА РАЁНА (сакратар райкома КП(б)Б тав. АЎДЗЕЙЧЫК, старшыня райвыканкома тав. РУСАК). Сураскі леспрамгас выканаў дзяднае заданне за першую пяцідзённку на 10,5 проц. па лесаматэрыялах і на 1,4 проц. ПА ДРОВАХ. Рад сельсоветаў (СТАНКАЎСКІ, ЯНАВІЦКІ і інш.) упарта адмаўляюцца заключаць дагаворы на вывазку. У самім леспрамгасе таксама не ўсё добра. Дырэктар ВОЛЬПЕРТ ніяк не можа прымусіць начальнікаў участкаў выконваць яго распараджэнні. Не наладжан кантроль над выкананнем дагавораў аб вывазцы. Пераход на брыгадную сістэму работы закончан толькі на 30 проц. Снабжэнне дрэннае. У магазінах ОРС'а пуста. Начальнік ОРС'а МАЗНІКАЎ бяздзейнічае, сарваў па-запланавыя закупкі і т. д. А тав. Аўдзейчыка і тав. Русака ўсё гэта не датычыць, быццам леспрамгас быў нейкай аўтаномнай рэспублікай, у справы якой не рэкамендуецца ўмешвацца.

Вельмі спакойна адносіцца да лесавывазкі старшыня ГЛУСКАГА РВК тав. ШЛЯХТУНОЎ. Дакладных лічбаў ён не ведае, але мяркуе, што наяўная колькасць фурманак не забяспечвае лесавывазку. Ён ведае так сама, што ў чацвертым квартале быў прарыў. Тым не менш, тав. Шляхтуноў чагосці чакае. Чаго — і сам не ведае. Работа вялікая і ён не адкладае з дня на дзень. Між тым першая пяцідзённка дала 10 проц. дзяднага задання замест 50.

СТАРШЫНЯ ЎЗДЗЕНСКАГА РАЙВЫКАНКОМА таксама не ведае, як працуе леспрамгас. Але ён спадзяецца, што да 10 СТУДЗЕНЯ (!) план IV-га КВАРТАЛА будзе закончан. А што з планам ПЕРШАЙ ДЗКАДЫ СТУДЗЕНЯ? Можа, па думцы старшыні ўздзенскага РВК, студзень, пачнецца ў лютым?

Вышэй прыведзеныя факты даволі ярка выяўляюць прычыны прарыва ў лесазагатоўках і лесавывазцы. Гэтыя прычыны — у апартуністычнай бяздзейнасці многіх раённых арганізацый, у недаацэнцы ўсёй вялікай ролі і значэння сваячасовай загатоўкі і вывазкі песаматэрыялаў і дроў. Адкладваць ЗАРАЗ лесавывазку, калі ўстанавілася добрая санная дарога, г. зн. СВЯДОМА асуджаць лесавывазку на прарыў.

Р. Б.

ПЕРАМОГІ ЛЕНІНСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ПАЛІТЫКІ

З прамовы тав. А. ХАЦКЕВІЧА на с'ездзе ЦВК СССР

Таварышы, нашы поспехі ў галіне соцыялістычнага будаўніцтва абумоўлены тым, што мы па-большавіцку ажыццяўляем ленінскую лінію нашай партыі, якою кіруе генеральны правадыр і лесны ленінец тав. СТАЛІН.

Беларуская Савецкая Соцыялістычная Рэспубліка хутка будзе святкаваць сваё 15-годдзе. Гэта—факт вялікага палітычнага значэння, які яшчэ раз ярка знамянуе перамогу ленінскай нацыянальнай палітыкі.

Да рэволюцыі прамысловасць Беларусі была самай дробнай, напаўсаматужнай. Але і гэта дробная, напаўсаматужная прамысловасць Беларусі была амаль знішчана імперыялістычнымі акупантамі.

Што-ж мы маем зараз? Зараз Савецкая Беларусь мае дзесяткі новых, узброеных перадавой тэхнікай заводаў скуранай, запалкавай, дрэваапрацоўчай, шкляной, тэкстыльнай, харчовай, шэйнай, керамічнай і металічнай прамысловасці.

Замест некалькіх сотень рабочых у дарэволюцыйны час, зараз мы налічваем дзесяткі тысяч.

Да рэволюцыі ў БССР звыш 60 проц. усіх зямель знаходзілася ў руках памешчыкаў і буйных кулакоў. Галеча, беднасць, малазямелле, перасяленне ў розныя месцы аж да эміграцыі ў Амерыку—вось характэрныя рысы дарэволюцыйнай сельскай гаспадаркі Беларусі. А цяпер звыш 52 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак знаходзіцца ў калгасах. Створана 430 буйных совецкіх гаспадарак. Мы маем 63 МТС з трохтысячным трактарным паркам. Значна павялічыла ся прадукцыя сельскай гаспадаркі. Тысячы калгаснікаў ужо сталі заможнымі.

Возьмем іншу культурнага будаўніцтва. Рэволюцыі 70 проц. насельніцтва Беларусі было няграматным. Не было ні адной вышэйшай школы, ні адной дзяржаўнай школы беларускай, яўрэйскай, украінскай, польскай, латышскай, літоўскай і нямецкай мовах. Нацыянал прыгнёт царызма дасягаў выключных размераў.

У сучасны момант Совецкая Беларусь мае вузаў, 45 розных даследчых інстытутаў і Акадэмію навук. БССР ліквідавала няграматнасць і прадзіць усеагульнае абавязковае навучанне на базе сямігадовай школы. Бурна расце нацыянальная форме і соцыялістычная зместу культура. Школы, тэатры, кіно, журналы, газеты абслугоўваюць насельніцтва розных нацыянальнасцяй на іх роднай мове.

Новыяколы і дзіцячыя дамы пабудаваны ў самых глухіх, у самых адсных кутках Совецкай Беларусі. Гэтым годзе мы закончылі пазову буйнейшага будынка—Дома ўрада ў 11 паверхаў. Мы паставілі грамадны помнік Уладзіміру Ільічу Леніну работы лепшынайстроў Совецкага Саюза.

Толькі за першую пяцігодку асноўныя фонды БССР узраслі больш на 400 проц. Аб'ём капіталаданняў у народную гаспадарку БССР дасягнуў 1.045 млн. р., у тым ліку мы ўклалі ў прамысловасць 338 млн і ў сельскагаспадарку 237 млн. руб.

Мінасць электрастанцый БССР тысячах кілават у 1927-1928 складала толькі 14 тыс. клв, а ў 1933 г.—ужо 70 тыс клв. Выпрацоўка электраэнергіі ў 1928 г. дасягнула 35 млн. клв., у 1933 г.—220 млн клв. Валавая прадукцыя прамысловасці ў 1928 годзе складала 24 млн., у 1933 г. —1.030 млн. руб.

Уся пасеўная плошча Беларусі ў 1916 г. налічвала 2.389 тыс. га. У 1933 г. яна складае 3.711 тыс. га, у тым ліку соўгасы займаюць 239 тыс. га і калгасы 1.863 тыс. га.

Непраезджыя раней дарогі па лясах і балотах Беларусі зараз у значнай ступені заменены шасейнымі і гравійнымі дарогамі.

На соцыяльна-культурныя мерапрыемствы ў 1928 г. мы затрачвалі 52.700 тыс. руб. А ў 1933 г. затрацілі 252,5 млн. руб. Параўнайце гэтыя простыя лічбы, і вы ўбачыце аграмадны рост БССР ва ўсіх галінах.

Такі ў кароткіх рысах агульны вынік соцыялістычнага будаўніцтва Беларусі да яе 15-годдзя.

Совецкая Беларусь дабілася да свайго 15-годдзя аграмаднейшых поспехаў, дзякуючы брацкай дапамозе ўсяго Совецкага Саюза. БССР заўсёды і пастаянна атрымлівае вялікую палітычную, маральную і матэрыяльную дапамогу з боку саюзнага ўрада, у прыватнасці, т. т. Калініна і Молатава.

Комуністычная партыя большэвікоў Беларусі дасягнула гэтых аграмадных поспехаў на фронце соцыялістычнага будаўніцтва ў барацьбе за генеральную лінію ВКП(б), у барацьбе за ажыццяўленне ленінскай нацыянальнай палітыкі, у барацьбе за рашучае ўмацаванне органаў дыктатуры пролетарыята, за выкананне ўказанняў любімейшага геніяльнага правадыра нашай партыі — т. СТАЛІНА.

З гэтай трыбуны выступалі прадстаўнікі УССР, расказаўшыя, як буржуазныя украінскія нацыяналісты, гэтыя агенты імперыялізма, прабавалі сарваць соцыялістычнае будаўніцтва на Украіне. Як і ў УССР, так і на Совецкую Беларусь імперыялістычныя інтэрвенты не раз рабілі ў мінулым замах, але сустрэлі жалезны адпор з боку рабочых і сялян Краіны Совецкаў.

УССР і БССР аднадушна перажывалі імперыялістычную акупацыю. Побач рука ў руку рабочыя і працоўнае сялянства УССР і БССР у радах Чырвонай арміі і партызанскіх атрадах змагаліся за вызваленне Совецкай Украіны і Совецкай Беларусі, за заваяванне Окцябрскай рэволюцыі на Украіне і ў Беларусі.

Мы ведаем, што Украіна, і неадлучна з яе Беларусь, сістэматычна ўключаюцца ў агульны план інтэрвентаў, якія імкнуцца адарваць ад СССР Украіну і Беларусь, захапіць УССР, як эканамічна моцную рэспубліку нашага вялікага Саюза, захапіць Совецкую Беларусь і тым самым адкрыць подступ да чырвонай сталіцы Совецкага Саюза—да Масквы.

За час існавання совецкай улады, у гады вострай класавай барацьбы, на Украіне і ў Беларусі мы раскрылі не мала контрраволюцыйных арганізацый, часта прыкрываўшыхся фальшывым нацыянальным сцягам.

Гэтыя контрраволюцыйныя арганізацыі ў Беларусі нязменна мелі сваіх прадстаўнікоў на Украіне. Калі яны раскрываліся ў нас і, наадварот, калі яны былі раскрыты на Украіне, то выяўлялася, што украінскія контрраволюцыйныя арганізацыі мелі сваіх прадстаўнікоў у Беларусі і ў Акадэміі Навук, у Наркамасвеце, Наркамземе і ў другіх совецкіх органах.

Контрраволюцыйныя планы і праграмы нашых ворагаў і на Украіне, і ў Беларусі палкам зыходзіла дзяцца. Мэты і задачы контрраволюцыйных буржуазных нацыяналістаў—заклятых ворагаў Совецкага Саюза—ясны. Гэта—адрыў Совецкай Беларусі і Украіны ад СССР і далучэнне іх да капіталістычнага Захада.

Пленум ЦК комуністычнай партыі большэвікоў Беларусі прызнаў, што ў маштабе ўсяго СССР і ўсёй ВКП(б) галоўнай небяспекай, як і раней, астаецца вялікадзяржаўны шавінізм. Разам з тым пленум ЦК партыі падкрэсліў, што гэта ні ў якай меры не пярэчыць таму, што ў БССР, як і на Украіне, на сённяшнім этапе галоўную небяспеку ў нацыянальным пытанні прадстаўляе мясцовы нацыяналізм, які змыкаецца з імперыялістычнымі інтэрвентамі. Мы павінны яшчэ больш узмацніць рэволюцыйную большэвіцкую пільнасць.

Буржуазныя нацыяналісты на ўказцы капіталістаў, ідучы з імі ў нагу ў падрыхтоўцы вайны супроць Совецкага Саюза, падрыхтоўваюць знутры антысовецкую інтэрвенцыю. У гэтым ёсць тое галоўнае, тое небяспечнае, што мы павінны мець на ўвазе. І кожнага буржуазнага нацыяналіста мы павінны сваячасова выкрываць, ускрываць яго контрраволюцыйную сутнасць і выганяць яго з нашых радоў, дзе-б ён не знаходзіўся—у партыі, у совецкай установе або ў грамадскіх нашых арганізацыях.

Рабочыя, калгаснікі і працоўныя масы БССР праводзілі і будуць праводзіць генеральную лінію нашай партыі ў штодзённай рабоце па будаўніцтву соцыялізма ў нашай краіне. Мы цвёрда ажыццяўлялі ленінскую нацыянальную палітыку і будзем таксама цвёрда, па-большэвіцку праводзіць яе ў далейшым і дабіёмся новых перамог соцыялізма (Апладысменты).

Эшалон дроў у гонар XV з'езда КП(б)Б

ЖЛОБІН (Ад нашага спецкора).

Паводле апошняга загада кіраўніцтва Заходняй чыгункі 6-ы эксплуатацыйны раён павінен забяспечыць штодзённую нагрузку для Менска 72 вагонаў дроў. Балястныя вагоны вяртушак заменены крытымі вагонамі, што дасць магчымасць па вялічыць нагрузку кожнага вагона да нармальных размераў.

За першыя 6 дзён студзеня было нагружана 420 вагонаў, што складае 70 вагонаў у дзень. 12 вагонаў 6-ы раён за гэтыя дні неладаў. У прысутнасці прадстаўніка рэдакцыі «Звязды» начальнік раёна тав. Ерамаеў аддаў загад, каб гэтыя 12 вагонаў былі адгружаны і каб ў далейшым грузілася штодзённа не менш 72 вагонаў — у адпаведнасці з адказным планам. Тав. Ерамаеў абяцаў асабіста сачыць за выкананнем адказнага плана адгрузкі дроў Менску і абавязаўся ў гонар XV з'езда КП(б)Б нагрузіць адзін эшалон дроў звыш плана.

У справу бесперабойнай падачы дроў Менску ўключыўся таксама па літаддзел раёна. Намеснік начальніка політадзела тав. Осіпаў паведаміў, што політадзел арганізаваў свой кантроль над ходам нагрузкі маршрутаў дроў для Менска. Політадзел абавязаўся не толькі выканаць, але перавыканаць студзеньскі план адгрузкі дроў Менску.

Для паскарэння зварота вагонаў палова паравозніка будзе штодзённа накіроўвацца ў распараджэнне Асіпавіцкага дыспетчара. Начальнік раёна тав. Ерамаеў звярнуўся з просьбай да начальніка ст. Менск тав. Ладзіса накіроўваць разгружаны паравозник з Менску цягніком № 856, які адыходзіць з Менску ў 16 г. 15 мін.

Трэба спадзявацца, што абавязацельствы 6-та эксплуатацыйнага раёна не застануцца на паперы.

Н. Г.

Аўтатранспарт зрывае вывазку дроў

Замест узмацнення вывазкі дроў, менскі аўтатранспарт прадаўжае працаваць ганебнымі тэмпамі. 6-га студзеня на вывазцы дроў працавалі толькі тры машыны: дзве МГРК і адна Белдзяржснаба. Усе тры машыны зрабілі па адным рэйсе і вывезлі ўсяго 9 кбм. дроў.

7-га студзеня працавалі пяць машын: адна Саюзтранса, адна Белгандля і 3 МГРК. Яны зрабілі па аднаму рэйсу і вывезлі 18 кбм. дроў.

8-га студзеня працавалі 8 машын: Саюзтранса —4, МГРК —3 і Белгандля 1. Зрабіўшы таксама на аднаму рэйсу, яны вывезлі 44 кбм. дроў.

Між тым паводле плана павінны штодзённа працаваць па вывазцы дроў 45 аўтамашын. Штодзённа павінна вывозіцца каля 190 кбм. дроў. Калі-ж аўтатранспарт выканае свае заданне?

Што скажа на гэта Менгарсавет і гарКК-РСІ?

ФІНАНСАВАЯ АФЁРА ВА ФРАНЦЫІ

ПАРЫЖ, 9 студзеня (БЕЛТА).

У пісьме прам'еру Шотану міністр калоніі Далім'е матывуе сваю адстаўку, жаданнем, каб габінету Шотана не ставілі ў віну яго дзеяння. Далей указваецца, што ён хоча быць свабодным ад афіцыяльных абагаўлянняў, каб апраўдацца ад абвінавачанняў, якія на яго ўзводзяцца.

У адказным пісьме Шотан прызнае адсутнасць у дзеяннях Далім'е непрыстойных момантаў. Гэты абмен пісем паказвае, што выхад з пяжка га становішча для габінета Шотана быў знойдзен у такога рода «ганаровай» адстаўцы, пры якой Шотан у спецыяльным пісьме рэабілітаваў гонар Далім'е.

Як паведамляюць газеты, Шотан намеран прапанаваць палаце дэпутатаў рад мер, якія маюць на мэце даказаць рашучую гатоўнасць урада пакараць асоб, замешаных у афёры Ставіцкага, і тым самым адказаць на кампанію, накіраваную на кампраметаванне габінета. Так, указваюць, што ў сувязі з тым, што прэфект паліцыі К'яп сур'ёзна скампраметаваў сябе сістэматычным апекаваннем Ставіцкага, Шотан прапануе правесці сур'ёзную рэарганізацыю паліцыі з тым, каб скасаваць пост прэфекта паліцыі Сенскага дэпартамента і сканцэнтраваць усё кіраўніцтва паліцыяй у руках «Сюрэтэ жэнераль».

Побач з гэтым паведамляюць, што як высветліла следчая камісія, якая працуе пад старшынствам генеральнага пракурора, на працягу апошніх 5 год супроць Ставіцкага было ўзбуджана 19 справ па абвінавачанню ў машэнніцкіх учынках, але ўсе яны былі спынены дзякуючы наяўнасці якіхсці высокіх ашекуноў.

Адначасова з гэтым па распараджэнню ўлад арыштован рэдактар газет «Мідзі» і дырэктар сатырычнага журнала «Беке Онгль» Даррык па абвінавачанню ва ўдзеле ў афёрах Ставіцкага.

Інтэрпеляцыі аб справе Ставіцкага будуць абмяркоўвацца ў палаце 11-га студзеня. Газеты паведамляюць, што Ставіцкі быў насіцінут па ліцыяй у бязлюдной вілле, якую зняў для яго супрацоўнік «Валонтэ» Пігаліо. Калі паліцыя пранікла ў дом, Ставіцкі выстраліў сабе ў высок. Аднак, рад газет сумняваецца ў праўдзівасці версіі аб самагубстве.

Заяўляюць, што інфарматар охраны і судовай паліцыі Ставіцкі быў забіт паліцэйскімі агентамі з мэтай унікнуць скандальных выкрываннняў, якія-б маглі ўспыльць пры следстве ці на працэсе Ставіцкага. Указваюць, што ў справе скампраметаваны відныя дзеячы палітычнага і фінансавага совета і самой паліцыі, для якіх было абсалютна неабходна ўбраць Ставіцкага.

Паводле апошніх вестак, у становішчы Ставіцкага, які знаходзіцца пры смерці, намецілася ўсё-ж некаторае паляпшэнне.

***

ПАРЫЖ, 9 студзеня (БЕЛТА).

Паводле апошніх вестак, Ставіцкі памёр у больніцы. Як паведамляе Гавас, следчыя ўлады па ўказанню адной з блізкіх да Ставіцкага асоб знайшлі ў вілле Ставіцкага ў шафе канверт, у якім нібыта змяшчаецца завяшчанне Ставіцкага.

КАЗНЬ ВАН ДЭР-ЛЮББЕ

БЕРЛІН, 10 студзеня (БЕЛТА). 10-га ў 7 гадз. раніцы вынесены Ван дэр-Люббе смяротны прыгавор прыведзен у выкананне. Ва дварэ пейпцыгскага суда Ван дэр-Люббе адсечана галава.

ЯПОНІЯ СКАЛАЧВАЕ „МАНЧЖУРСКУЮ ІМПЕРЫЮ"

ТОКІО, 9 студзеня. (БЕЛТА).

Відавочна, у рэзультаце адмены забароны пісаць аб маючым быць абгалашэнні Пу-І імператарам Манчжуріі газеты паведамляюць аб шырокім руху ў Манчжоу-Го за абгалашэнне Пу-І імператарам. Адначасова газеты адзначаюць, што прызнана неабходным назначыць віцэ-ага японскага дзяржаўнага дзеяча «асабістым дарадцай Пу-І». Паводле слоў газет, гэты дарадца па сутнасці будзе замяняць манчжурскага прам'ера Чэна, які выконвае да гэтага часу ролю «апекуна Пу-І».

СТАНОВІШЧА Ў ФУЦЗЯНЕ

ТОКІО, 9 студзеня. (БЕЛТА).

Згодна паведамлення агенцтва Дэмпо цусін, фуцзянскія войскі пасля паражэння пад Шуйкоу адступаюць у беспарадку на Фучжоу. Лідэры фуцзянскага ўрада Чэн Мінсю і Цзян Гуан-най уцяклі ў Амой.

Морскі міністр Осумі ў дакладзе совету міністраў аб становішчы ў Фуцзяне ўказаў, што 19-я армія ў большасці яжкім становішчы.

АРЫШТЫ Ў ТОКІО

ТОКІО, 9 студзеня. (БЕЛТА).

Арыштавана 12 кіраўнікоў нелегальнай арганізацыі, якая займалася рэвалюцыйнай прапагандай па ўсёй краіне. Арганізацыю, паводле слоў паліцыі, узначальваў вядомы мастак Сабура, які знаходзіцца сярод арыштаваных.

СНЕДАННЕ У ГОНАР УСТАНАЎЛЕННЯ НАРМАЛЬНЫХ ДЫПЛАМАТЫЧНЫХ АДНОСІН ПАМІЖ СССР І ПАЗШ

БЕРЛІН, 9 студзеня. (БЕЛТА).

У адзнаку ўстанаўлення нармальных дыпламатычных адносін паміж СССР і ПАЗШ амерыканская гандлёвая палата ў Берліне наладзіла снеданне, на якім прысутнічалі шматлікія прадстаўнікі ПАЗШ і СССР, у тым ліку паўнамочны прадстаўнік СССР у Берліне тав. Хінчук, амерыканскі пасол Дод, прадстаўнікі амерыканскага пасольства, паўнамочнага і гандлёвага прадстаўніцтваў СССР, прадстаўнікі амерыканскіх дзелавых колаў, а таксама прадстаўнікі совецкага і замежнага друку.

Старшыня амерыканскай гандлёвай палаты (якая адначасова з'яўляецца прадстаўніком амерыканскага таварыства «Джэнэраль электрык») Пірс выступіў з прывітаннем па поваду ўстанаўлення нармальных дыпламатычных адносін паміж ПАЗШ і СССР.

Пасля прамовы Пірса Хінчук выступіў з дакладам, у якім асвятліў цяперашняе становішча і перспектывы совецка-амерыканскіх гаспадарчых адносін.

Прамова Хінчука была выслухана аўдыторыяй з велізарнай цікавасцю. Старшыня гандлёвай палаты Пірс падзякаваў Хінчука за яго даклад.

З усіх канцоў СССР

ПА КАНФЕРЭНЦЫЯХ БОЛЬШЭВІКОЎ ХАРКАВА

ХАРКАЎ, 9 студзеня (БЕЛТА).

Закончыліся раённыя партканферэнцыі сталіцы Украіны. Канферэнцыі прайшлі з вялікай актыўнасцю, пад знакам большэвіцкай самакрытыкі і паказалі рост ідэйна-палітычнага ўзроўню партарганізацыі.

Выступаўшыя на канферэнцыях аднадушна адзначалі дасягненні, якіх дабілася харкаўская партарганізацыя пад кіраўніцтвам т. ПОСТЫШАВА, аднадушна ўхвалялі работу гарадскога партыйнага камітэта і гарадской КК.

Усе канферэнцыі ў прынятых рэзалюцыях аднагалосна прызналі палітычную лінію гарадскога партыйнага камітэта правільнай, а практычную работу яго здавальняючай.

Выбраны новыя склады раённых парткамітэтаў і дэлегаты на гарадскую і абласную партканферэнцыі. У ліку выбраных т. т. КАСІОР, ПОСТЫШАЎ, ПЯТРОЎСКІ, ЧУБАР, ПАПОЎ, ЯКІР, БАЛІЦКІ, ІЛЬІН, АЛЕКСЕЯЎ, ХВЫЛЯ і ІНШ.

ПЯЦІДЗЕСЯЦІТЫСЯЧНЫ ТРАКТАР ХТЗ

ХАРКАЎ, (БЕЛТА). Учора з вялікага катвеера Харкаўскага трактарнага завода імя Орджанікідзе зышоў 50-тысячны трактар.

ЧОРНАМОРСКАЯ НАФТА

НОВАРАСІЙСК, 9 студзеня. (БЕЛТА).

Разгортваюцца работы па эксплаатацыі чорнаморскіх месцазараджанняў нафты. На плошчы 80 га разведка закончана. Устаноўлена вялікая нафтаноснасць гэтай плошчы. На працягу гэтага года на чорнаморскіх нафтапромыслах будзе прасвідравана 24 тысячы метраў і здабыта 35 тысяч тон нафты.

ЗЗЫШРАННЯЯ СЯЎБА У ТУРКМЕНІІ

АШХАБАТ, 9 студзеня. (БЕЛТА).

У Туркменіі стаіць цёплая мяккая нагода. Калгасы Тэджэнскага раёна ў якасці вопыта пачалі звышраннюю сяўбу яравой пшаніцы. Калгасы імя Белікава, імя Атабаева і «Красный пахарь» ужо засеялі каля 20 га.

УСЕСАЮЗНЫ ДЗІЦЯЧЫ ЛЕКАВЫ КАМБІНАТ

ОДЭСА, 9 студзеня. (БЕЛТА).

К курортнаму сезону 1934 года за 20 клм. ад Одэсы ў Люстдорфе заканчваецца будаўніцтва ўсесаюзнага дзіцячага лекавага камбіната. Ужо пабудаваны два асноўныя санаторныя карпусы.

ПА БССР

ГАРАДЫ ЗМЯНЯЮЦЬ СВОЙ ТВАР...

* У Маскве, Ленінградзе і ў Менску—НК камунальнай гаспадаркі БССР распрацоўваюцца праекты пла навання і рэканструкцыі шасці гарадоў нашай рэспублікі: Менска, Гомеля, Віцебска, Магілева, Бабруйска і Полацка.

Праект планавання і рэканструкцыі Гомеля ўжо складзен у Маскве. Праект рэканструкцыі Менска рыхтуецца ў Ленінградзе. Схемы праектаў для Віцебска, Магілева, Бабруйска і Полацка распрацоўваюцца сіламі НК камунальнай гаспадаркі БССР.

* Гарады зменяць свой твар да непазнаваемасці. Віцебск стане буйнейшым індустрыяльным тэкстыльным цэнтрам БССР. У горадзе будуць пабудаваны грандыёзны парк культуры і адпачынку на тэрыторыі ў 100 гектараў, шматпавярховы дом гарсовета, дом сацыялістычнай культуры. Прыгарадная зона, радыюсам у 15 клм будзе электрыфікавана. Ужо ў гэтым годзе для планавання горада адпускаецца 90.000 рублёў.

* Полацак стане адным з цэнтраў дрэваапрацоўчай і цэльнай прамысловасці БССР. Тут будзе так сама пабудаван новы буйнейшы камбінат па выпуску брэзента. На тэрыторыі ў 40 гектараў разбіваецца парк культуры і адпачынка. У корані рэканструюецца валаснабжэнне. Норма валаснабжэння на аднаго чалавека з 8 літраў павялічыцца да 100.

* Менск у асноўным каналізован. На далейшую каналізацыю Менска ў гэтым годзе адпускаецца 2.120.000 рублёў. За апошні час каналізацыйная сетка Менска павялічылася з 24,5 клм. да 28,4 кілометра. Такія-ж работы па каналізацыі разгортваюцца ў Гомелі і Віцебску.

* Толькі пяць гарадоў Беларусі—Менск, Віцебск, Гомель, Магілеў і Мазыр мелі валаправоды да рэволюцыі. За апошнія гады карэнна рэканструяваны існуючыя і пабудаваны тры новыя валаправоды. Ідзе работа па пабудове новых валаправодаў у Барысаве і Рэчыцы. Пабудаваны новыя валаправоды ў Оршы, Бабруйску і Полацку. На будаўніцтва новага валаправода ў Віцебску адпушчана 1.100.000 рублёў.

* 34.000.000 рублёў было выдаткавана ў 1933 годзе на жыллёвае і комунальнае будаўніцтва ў БССР. У бягучым годзе на гэтыя мэты адпушчана 44.000.000 рублёў. У адно толькі жыллёвае будаўніцтва будзе ўкладзена 27.000.000 рублёў.

У Менску, Гомелі і Віцебску будуць пабудаваны дамы для спецыялістаў на 200 кватэр. У Менску намечаны будаўніцтвам новая гасцініца, коштам у 1.000.000 рублёў, дом советаў і новы 52-кватэрны дом. Ужо ў бягучым годзе будзе скончана будаўніцтва трох 24-кватэрных каменных дамоў у Менску.

* Новыя лазнярныя камбінаты ўступаюць у строй у 1934 годзе ў Віцебску, Оршы, Полацку, Барысаве і іншых раённых цэнтрах БССР.

* Сем трамвайных ліній пракладзена ў Менску. Працяжнасць пуці павялічылася з 3.750 метраў да 33.000. За год перавезена 35.000.000 пасажыраў. Колькасць трамвайных вагонаў павялічылася да 35. У бягучым годзе трамвайнае будаўніцтва значна пашырыцца. Разгортваецца генеральная рэканструкцыя віцебскага трамвая.

ЭЛЕКТРАЎБОРКА...

ЭЛЕКТРЫФІКАЦЫЯ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ БССР У 1934 ГОДЗЕ

РАСЦЕ электрыфікацыя сельскай гаспадаркі БССР. Ужо да многіх соўтасаў, МТС, калгасаў ідуць электрычныя правады. У 1933 годзе сельскую гаспадарку абслужылі 45 самастойных электрастанцый і 115 падстанцый. Былі электрыфікаваны 63 соўтасы, 30 машынатрактарных станцый і 67 калгасаў. 300 электраматораў далі энергію 75 малацільным і 44 сіласным пунктам і т. д. 5 спецыяльных перасоўных фургонаў абслужылі 8 неэлектрыфікаваных соўтасаў і калгасаў. І ў заключэнне—атульная лічба: ужо ў мінулым годзе на вёсцы было 13.000 электракропак.

1934 год будзе годам далейшага разгортвання (яшчэ большага і па аб'ёму і па тэмпах) электрыфікацыі сельскай гаспадаркі Совецкай Беларусі.

Толькі па лініі Наркамзема БССР устанаўляецца 15.000 новых электракропак. Будуць устаноўлены 600 матораў, магутнасцю ў 3.000 квт. У пяцідзесяці калгасах будуць пабудаваны электрастанцыі. Электрыфікуюцца дадаткова—50 калгасаў, 20 соўтасаў, 20 МТС і МТМ, якія будуць забяспечаны электраэнергіяй на 50 проц. ад самастойных электрастанцый. Упершыню ў БССР будзе арганізавана 68 ЭЛЕКТРАЎБОРАЧНЫХ ПУНКТАЎ.

План 1934 года прадугледжвае будаўніцтва 13 сельска-гаспадарчых электрастанцый. Задача заключаецца ў тым, каб сваячасова падрыхтаваць кваліфікаваныя кадры для электрыфікуемай соўтасна-калгаснай вытворчасці.

Электрычнасць усё больш укараняецца ў вытворчую работу нашых соўтасаў, МТС, калгасаў, у быт калгасніка.

Ш—Ч.

УСЕБЕЛАРУСКАЯ АЛІМПІЯДА ДЗІЦЯЧАЙ МАСТАЦКАЙ САМАДЗЕЙНАСЦІ

Наркамасветы БССР пастанавіў правесці ўсебеларускую дзіцячую алімпіяду мастацкай самадзейнасці і агляд юных дараванняў.

Алімпіяда праводзіцца ў школах і піонератрадах па музыцы, спевах, дзіцячых малюнках, скульптуры, пастаноўках і т. д.

Пачаўся агляд самадзейных гурткоў і творчай работы паасобных выканаўцаў у школах і піонератрадах на вылучэнне кандыдатаў на раённыя і гарадскія алімпіяды, на якіх будуць выбраны калектывы і лепшыя адзінкі для ўдзела ў рэспубліканскай алімпіядзе.

Рэспубліканская алімпіяда адбудзецца ў чэрвені ў Менску ў часе ўсебеларускага піонерскага злёта. Лепшыя ўдзельнікі будуць прэміяваны і пасланы на ўсесаюзную дзіцячую алімпіяду.

Для кіраўніцтва алімпіядай створан штаб у складзе наг. культпропа ЦК КП(б)Б т. **ТАМАРКІНА**, нам. наркома асветы тав. **ДУНЦА**, народнага паэта рэспублікі **ЯКУБА КОЛАСА, АЛЕКСАНДРОВІЧА, ГІТГАРЦА, РАФАЛЬСКАГА, ЛІТВІНАВА, ХАРЫКА** і інш. (БЕЛТА).

КАМЕРЦЫЙНЫ ГАНДАЛЬ СЕНАМ

СНК БССР пастанавіў арганізаваць з 10-га студзеня ў Менску па лініі Белгандля дробна-аптовы гандаль сенам па цэнах, устаноўленых Советам працы і абароны (200 руб. за тону).

Для арганізацыі пункта па продажу сена менскі гарсовет адвёў Белгандлю прыгарэльсавы ўчастак. Белгандлю прапанавана правесці ўсе неабходныя мерапрыемствы па будаўніцтву і абсталяванню сеннага пункта (навесі, вазавыя вагі).

Водпуск сена ў адны рукі абмяжоўваецца адной тонай.

Для бесперабойнай рэалізацыі сена прапанавана беларускай канторы Загатзярно забяспечыць завоз сена ўстаноўленых кандыцый у Менск з такім разлікам, каб да першага красавіка 1934 года ўвесь фонд сена, вызначаны для рэалізацыі ў Менску, быў завезен.

ХРОНІКА

* ПЕРШАЯ ЗАВОДСКАЯ АГАРОДНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ менскіх металістаў і іх жонак адбудзецца 14-га студзеня. На канферэнцыі будуць вызначаны канкрэтныя мерапрыемствы па рэалізацыі пастановы СНК БССР аб рабочым агародніцтве. ЦСПОБ абавязаў фабзаўмясцкомы аказваць рабочым, жадаючым завесціся індывідуальнымі агародамі, грашовую дапамогу праз касы ўзаемадапамогі для закупкі насення, інвентара і т. д.

* ПРАЗ САНАТОРЫІ І ДАМЫ АДПАЧЫНКУ ў бягучым годзе будуць прапушчаны тысячы ўдарнікаў-асветнікаў БССР. Толькі па лініі соцстраха на гэтую мэту адпушчана 260 тыс. руб. У мясцовыя дамы адпачынку будуць накіраваны 2.020 чал., у санаторыі 182. Закуплены сотні пуцёвак на курорты і ў дамы адпачынку саюзнага значэння.

* НАЧНЫ ПРАФІЛАКТОРЫЙ, першакласна абсталяваны, адкрываецца гэтымі днямі на віцебскай фабрыцы «СЦЯГ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ». Такія-ж профілакторыі адкрываюцца па бабруйскім лесакамбінаце імя Гікало і добрушскай фабрыцы.

ПАВЕДАМЛЕННІ

Рэспубліканская камісія па чыстцы КП(б)Б паведамляе, што 13 студзеня ў 10 г. ран. у г. Менску (Дом урада, правае крыло, 2 паверх, пак. 266) будзе працаваць рэспубліканская камісія па чыстцы па разбору апеляцый на рашэнні менскай гарадской камісіі наст. т. т.:

Фіалкін Г. І., («Чырв. змена»), Турбкін І. П. (свінтрэст), Мацаноў І. Д. (НДІ ком. вых.), Салей А. Г., Лядоўскі А. М., Літвіненка Е. Л., Пратасеня Г. І., Крывіцкі Е. Г., Крукоўскі А. О., Круцелёў Ф. М., Кірэйчык З. К., Вапне Б. В., Чаркоўская О. Ф., Свірноўская Ф. М. (БелАН), Хацкін Л. Б. (інстытут сов. права), Віннік Я. Г. (мединстытут), Межарыцкі Б. Л. («Калг. Беларусі»), Сушкевіч Ф. М. (Ільнатрактарацэнтр), Лодысеў А. Я. (ЦСПСБ), Слабодчык С. Ц., Файн З. Л., Чэрвінскі Л. Л., Іваноў Р. А. (мединстытут), Савін С. А. (Наргасулік), Перчэнок І. І. (2-я больніца), Лапатчэнка Г. В. (садова-гародні інстытут), Керштэйн А. І. (буд. ф-т палітэхн. ін-та), Каган А. М. (БДаВ), Жароў К. Д. (СНК). Данільчык С. К., Гехтэр С. Р. (Наргасулік), Апацкі А. Ф. (палітэхн. ін-т), Чэрнякоў Л. І. (рэд. газ. «Звязда»), Шапіра Л. Н. (ін-т сов. права), Семашка С. П., Форын Н. С. (рэд. «Калг. Бел.»), Валодзька В. А. (Наргасулік), Лашкевіч Г. І., Розаў Ю. М., Касценка А. І. (балотны ін-т).

***

Рэспубліканская камісія па чыстцы КП(б)Б паведамляе, што 13 і 14 студзеня г. г. у 10 гадзін раніцы ў г. **БАБРУЙСКУ** будзе працаваць рэспубліканская камісія па чыстцы па разбору апеляцый на рашэнні бабруйскай, глускай і парыцкай райкамісій на наст. тт.:

На 13 студзеня

Гельфанд В. М., Хваенскі Б. С., Вайнер Б. В., Тішкоў А. К., Трацэўскі А. А., Бокач І. Л., Паслядовіч Н. Ф., Адамчук П. К., Славін П. Б., Іоффе Х. Ш., Жук І. П., Навіцкі Ф. І., Меркін Л. С., Рынеўскі Е. К., Жызнеўскі Я. А., Сушынскі А. Е., Андрыеўскі П. С., Якубсон М. В., Фрайнгольд С. Г., Марозкі І. С., Фельтмахер Б. Г., Аронаў І. І., Кацнельсон А. З., Пінчук С. С., Зельдзін Б. Х., Крацэр Д. Л., Русін Н. М.—Бабруйск;

Казлоў Н. Е., Шырокі П. К., Тормаш А. П., Гарэлік Н. І., Іванова А. І., Рохлін Э. Ш., Коршак М. С., Старавойтаў Ф. С., Батура Н. В., Харытановіч М. А., Калпакоў І. А., Левертоў І. С., Качаноўскі А. К., Кавалерчык М. К., Магляс Ф. Е., Ліўшыц Л. Х., Мітраховіч Е. Н., Сіньковіч Г. В., Нехін А. Д., Клешчэнка М. Ф., Хоранеко А. М. Гарэлік Ю. А., Чайко П. Л., Скурчаеў С. М.—Парычы.

НА 14 СТУДЗЕНЯ

Шостак П. Т., Васякоў І. А., Малін І. З., Трафімаў Ф. Н., Шавчуліс С. К., Вермейчык Ф. І., Гурын К. І., Шэўчуліс С. К., Шэўчуліс Б.К., Кобяко Д. П., Куліцкі І. В., Даўбня В. Д., Жулега А. К., Гурчэнка М. Е., Вараноўскі П. П., Альтшулер І. М., Прахоцкі П. М. Казіміраза У. А., Хаўкін Л. Ю., Дзергачоў Я. А., Харкурын Л. І., Рэкоў-Ліўшыц Я. Э., Рышын А. С., Круглоў І. Ф., Богук Г. М., Рак С. П., Файнштэйн Б. Ш., Петроўскі І. І., Шэйка П. П., Бальяш Г. І., Гартвіг С. Л., Кірылёнак Н. І., Каленковіч В. І., Шыла М. І., Курачкін І. А., Станкевіч І. А., Яром С. Л., Родкін Е. Л., Верамейчык Ф. П., Грамыка М. А., Урыцкі М. М., Мазуркевіч А. У., Сініцкі Г. С., Осадчый З. П., Калінковіч В. І.—Глуск.

***

Рэспубліканская камісія па чыстцы КП(б)Б паведамляе, што 12 і 13 студзеня г. г. у 10 г. ран. у г. **АСІПАВІЧАХ** адбудзецца пасяджэнне рэспубліканскай камісіі па чыстцы па разгляду апеляцый на рашэнні раённых камісій наступных т. т.:

НА 12 СТУДЗЕНЯ

Станкевіч Л. І., Верагейка Т. І., Мамчук Н. Л., Шэйнін Х. М., Счыслёнок Ф. Я., Глебец А. Д., Міркін М. С., Дзетцеронак М. Д., Ільюшэнка І. Я., Лакіза, Хаткевіч М. В. (Клічаў).

Беамен Н. І., Брэзгалка Н. С., Кулеш П. Ф., Жаўнерчык П. Я., Сабалеўскі К. В., Курс П. К., Рысавец С. А., Зенкевіч В. К., Шымаловіч Н. С., Корсак В. А. (Пухавічы).

Рудой С. С., Казлоўскі В. А., Пікулін В. Б., Туміловіч С. І., Рымарэў Ф. П., Валуевіч У. М., Мулер Ф. В., Ольшэўскі Д. О., Зайцэў М. Т., Гапчароў М. С., Шкутко А. В., Семашка Ф. Ф., Маранц Х. С., Глебаў І. І., Чумакоў І. А., Кавалеўскі П. Ф., Телінга І. А., Патапенка Т. П., Дрож А. Н., Усаў І. І., Фукс Г. Б. (Асіпавічы).

НА 13 СТУДЗЕНЯ

Немагай М. А., Лухвіч Х. М., Лугавой Л. Ф., Скараход Н. В., Палешчук А. Р., Хіцкевіч С. І., Логвінаў П. І, Хацкевіч Т. М., Зінавенка Г. Ф., Марголін І. С., Забалотны Л. І., Башко І. А., Гальвас В. В., Кісялёва А. І., Эйзінец К. Ф., Джыбоўскі І. І., Каінцоў Н. Ф., Шукіс Н. А., Загор'ец Х. Г., Бужан Ф. С., Берковіч В. М., Бруднік Р. Ш., Мінтэнка Д. П., Кандрацэнка І. С., Крысковіч Ф. А. Пліско І. П., Курчэўскі А. К., Іскарскі А. М., Барпшай А. Х., Барпай І. М., Наўменка І. А., Грынфелц Е. І., Каплан Ш. Д., Аграна І. А., Стальмах І. О., Сасноўскі І. Л., Кавалёў Я. А., Пагоскі А. Ф., Сакалоўскі Э. Б., Івінскі Я. І., Шор Е. В., Бучэля К. К., Лосеў П.Г., Рагатка А. Н., Кавалёў І. Ф., Рбічык Г. І., Макарэвіч П. І., Старый І. А., Краўчэнка А. К., Патапенка П. К., Мысліўчык М. Я. (Асіпавічы).

Рэспубліканская камісія па чыстцы КП(б)Б.

Сакратарыят рэспубліканскай камісіі па чыстцы просіць нижэйказаных таварышоў, падаўшых апеляцыі на рашэнне раённых камісій па чыстцы, паведаць у рэспубліканскую камісію па чыстцы КП(б)Б раён, у якім яны праходзілі чыстку, і сваё месца жыхарства зараз:

Чэрнышоў І., Прахарэнка П. Ф., Кірст І. М., Іванка П. І., Акенчыц М. М., Вартынскі Влад., Ельніх Е. Г., АншоеЕ., Астапаў Г. М.

Рэспубліканская камісія па чыстцы паведамляе, што 3, 14 і 15 студзеня ў гор. **МАГІЛЕВЕ** будзе працаваць рэспубліканская камісія па чыстцы па разгляду апеляцый на пастановы магілеўскай, чавускай, рагачоўскай, быхаўскай і бялыніцкай райкамісій наступных таварышоў:

НА 13 СТУДЗЕНЯ

Чэслюк А. І., Панціловіч Н. М., Голендар Х. Я., Рапевінскі Ш. Л., Мадорскі Л. Л., Ерэдо І. К., Гуравіч Г. Л., Баранская А. С., Хрэнкін А. В., Домасная А. І., Боруткін М. М., Шыбе С. А., Рачынскі І. В., Тарасевіч Д., Стрэльцын С. А., Окс М. І., Бровер А. Г., Мар'яноўскі Н. Д., Андрэйчыкаў С. Г., Яропчанка П. А., Берын І. І., Рачкоўскі М. Р., Лазорэнка А. М., Хахлоў М. П., Рохлін Я. М., Казлоў П. В., Кас'янаў Д. Н., Славін О. Г., Філімонаў І. В., Сухараў З. А. (Магілеў).

Сырамалотаў М. І. Міхневіч Т. Ф., Панфіловіч Н. М., Малахоў Л. А., Оталяроў І. Г., Гаўрыленка М. Ф., Чубакоў Ф. Я., Дзенісенка В. Е., Шусцікава А. В., Зуеў С. Л., Купчын А. С., Дземянкоў Е. Т., Асапчая М. Ф., Скрэбнёў Н. П., Шпакова А. П.

НА 14 СТУДЗЕНЯ

Кісялёў М. С., Крупчэнка Т. П., Анішчэнка Г. С., Шудароў Г. Х., Шкарманкоў А. П., Шэрстнёў А. І., Бекасаў Д. І., Башхоў В. Г., Рудкоўскі А. Н., Хасенчук Ф. Я., Башарымаў П. Х., Карэнкоў Е. І., Знаскоў А. С., Варфаламееў С. Ф., Зельберборт Г. С., Заскінд І. Г., Летнікаў П. К., Ключнікаў І. А., Капітонаў К. А. (Чавусы).

Чэрбун Е. І., Скачкоўскі І. П., Рагаўцоў І. М., Аўласовіч І. Н., Бурачкоў А. М., Талонаў З. Г., Буякоў Ф. П., Сосенка С. Е., Калеснёў Н. О., Майсеенкаў І. М., Лагуноў А. Т., Кліменкоў В. С., Нізаўцоў І. С., Марчанка В. І., Казакевіч А. П., Буяноў Т. Л., Рабіновіч С. В., Шэметовіч П. П., Старавойтаў К. І., Тарасенка Н. А., Каўкоў І. Ф., Налуда В. Т., Чэртарыцкі М. С., Барздоў Г. Р., Гольдберг С. Ш. (Бялынічы).

НА 15 СТУДЗЕНЯ

Пузырэўскі А. П., Цімафееў А. С., Маргуноў С. С., Старавойтаў С. Е., Кулешоў М. С., Кірэйкаў Н. Т., Шабіляная І. І., Глінскі С., Тузаў Г. Д. (Быхаў).

Арэхінёнка С. Д., Юшпрах Б. Л., Пепрушэнка В. А., Нарбут А. С., Гельфер Е. М., Гінзбург Л. Е., Радкевіч Р. Г., Кацнельсон С. І., Хлебанаў Я. М., Двоскін В. М., Каган А. Я., Калінаў А. Р., Грахоўскі І. Ф., Майзельс І. Л., Каган Л. І., Бахтоніч Ф. Р., Шэшцын А. М., Гомкін І. Л., Рубанчык А. Х., Таджаеў Д. К., Шынкевіч С. Х., Малоскі С. Н., Франкель Е. Б., Мурэшка М. М., Расін Л. Н., Пазічкоў А. І., Слепян І. М., Пыж П. К., Лейкінд П. Р., Кітайчык С. Г.

Рэспубліканская камісія па чыстцы КП(б)Б.

Аддзел кадраў ЦК КП(б)Б абвяшчае аб наборы комуністаў на вучобу ў Горацкі сельска-гаспадарчы інстытут.

У інстытут прымаюцца асобы, маючыя апульна-асветную падрыхтоўку за 8-9 груп дзевяцігодкі, або рабфака, апраўдаўшыя сябе на практычнай рабоце ў прамысловасці і сельскай гаспадарцы.

Залічаныя ў інстытут комуністы забяспечваюцца стыпендыяй і слабжэннем, як перттысячнікі.

Заявы неабходна падаваць у райкомы і аддзел кадраў ЦК.

Згодна рашэння ЦК устанаўліваецца наступная развёрстка для раёнаў:

Менск — 20 чал., Гомель — 16 ч., Віцебск — 16 ч., Магілеў—14 ч., Бабруйск—10 ч., Орша—8 ч., Рэчыца—7 чал., Полацак—6 чал., Жлобін — 2 ч., Рагачоў—2 чал., Быхаў — 2 ч., Слуцак — 2 чал.

Дакументы на адабраных т.т. райкомы абавязваюцца прадставіць аддзелу кадраў ЦК к 15 студзеня 1934 года.

ЗАГ. АДДЗЕЛАМ КАДРАЎ ЦК КП(б)Б **ДЗЕНІСКЕВІЧ.**

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

БДТ-І Першы Дзярж. Тэатр

ФАНЗІЗІН.

Сёння, 11, і заўтра 12 студзеня

ПРЭМ'ЕРА

НЕДАРАСЛЬ

Пачатак ровна ў 8 гадзін.

Спазнішыяся да ближэйшага антракта у зал дапушчаны не будуць

Здымаць пальто, галошы, боты, галёўныя ўборы—абавязкова.

КІНО-ТЭАТР ЧЫРВОНАЯ ЗОРНА — Совецкі мастацкі фільм **СПРАВА ТАРЫЗЛІН МІКЛАВАДЗЕ** У фае—Канцэртнае адзял.

КІНО Пролетарый Каса—з 4 г. — Мастацкі кіно-роман **УКРАЗІЯ** (БЯГЛЕЦ) 1-я серыя ў 10 частках.

Кіно „Інтэрнацыянал" — Совецкі мастацкі фільм **ДЗЯЎЧЫНА З ПАЛУБЫ**

КІНО СПАРТАК — Мастацкі фільм **„ПЕСНЯ АБ ПЕРШАЙ ДЗЯЎЧЫНЕ"** драма ў 6 частках.

ДЗІЦЯЧЫ-ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР — Сёння мастацкі фільм **ЮДА** у 6 частках. У праграме гукавая хроніка

Беларускі тэхнікум фізкультуры

АБВЯШЧАЕ

НАБОР СТУДЭНТАЎ,

які працягваецца да 27-1—34 г.

Студэнты забяспечваюцца інтэрнатам, сталоўкай, стыпендыяй і снабжэннем па 1-му спісу. Стыпендыя выплачваецца на 1-м курсе ад 60—80 руб., на 2-м курсе ад 80—105 руб. і на 3-м ад 105—125 руб.

Прымаюцца асобы з адукацыяй у абёме сямігодкі. У першую чаргу прымаюцца значкоўцы маючыя дасягненні ў спартыўнай тэхніцы.

Да заявы неабходна дадаўчыць: давед. аб сац. становішчы і паходжанні, аб адукацыі, аб нараджэнні, заверанную анкету, 2 фотакарткі

Заявы накіроўваць—Менск, 2-гі Дом Советаў, Вышэйшаму Совету Фізкультуры

Дырэкцыя.

СМАЛЛІНСКІ ТЭХНІКУМ НАСЕННІЦТВА,

які рыхтуе агранамаў насеннаводаў сярэдняй кваліфікацыі.

АБВЯШЧАЕ

СТУДЗЕНЬСКІ НАБОР

студэнтаў на 1-ы курс.

Прымаюцца асобы, маючыя адукацыю сямігодкі. Прымаюцца забяспечваюцца стыпендыяй на 70 проц. в інтэрнатам на 100 проц. Пры тэхнікуме ёсць сталоўка, лазня, пральня і ўласная гаспадарка.

Заявы з дакументамі, згодна давед ніка, прымаюцца да 25 студзеня па адрасу: п.-а Смалляны, Аршанскага раёна, тэхнікуму Насенняводства.

Дырэкцыя.

Барысаўская лесашкола „ЛПВ" трэста „Лесбел"

АБВЯШЧАЕ

СТУДЗЕНЬСКІ НАБОР у школу

У колькасці 60 чал. па наступных спецыяльнасцях:

1. Кваліфікаваных рочых-брыгадзіраў па валцы і раскрайцы леса—30 чал., тэрмін навучання —месяцаў.
2. Кваліфікаваных рочых-брыгадзіраў па малявому і плямому сплаву—30 чал.; тэрмін навучання 6 месяцаў.

Прыём з асветай 5 груп сямігодкі. Узрост—не ніжэй 17 г. Прынятыя за бяспечваюцца стыпендыяй ад 45 да 75 руб. у месяц, у залежнасці ад паспяховасці, сталоўкай і інтэрнатам.

Прыём заяў — Пачатак заняткаў—з 25 студзеня. Заявы неабходна прыкласці: заверанную копію, даведку аб соцстановішчы і самой метрыку, аб асвеце і праве голаса, з усімі дакументамі накіроўваць адрасу:

гор. Барысаў, Андрэйская 22, лесашкола.

Дырэкцыя лесашколы М. ГУРМАН.

Гарадоцкі тэхнікум механізацыі сельскай гаспадаркі

(трактарны) у горадку, на Віцебшчыне,

абвяшчае прыём 1 курс.

Жадаючыя паступ. у тэхнікум павінны да 10 студзеня 34 г. падаць заяву, да якой дакласці: Пасведчанне аб узросце (прымаюцца 15 да 35 год); 2) Дакумент аб сканчэнні сямігодкі; 3) Пасведчанне аб прыёмы воспы і аб стане здароўя; 4) Дакумент аб соцыяльным стане і стажы вытворчай работы на самага паступаючага, так і яго бацькоў; 5)